# ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ

Выпуск №2 (40) (люты)

www.litbel.org www.novychas.gmail.com

Культурна-асветніцкі праект Грамадскага аб'яднання «Саюз беларускіх пісьменнікаў» і «Новага часу»


Анонс


«ПАМЯЦЬ»: згадкі Генрыха ДАЛІДОВІЧА пра Івана ШАМЯКІНА ........ 2
«ПРОЗА»: фрэскі Барыса ПЯТРОВІЧА ........ 3
«ПАЭЗІЯ»: новыя вершы Генадзя БУРАЎКІНА ........ 4
«ПРОЗА»: апавяданне Уладзіміра МІХНО «Капешка» ........ 5
«БЫЛІЦА»: аповед «Здрадная свіння» Паўла ЛЯХНОВІЧА ........ 6
«ЭСЭ»: Готландскія відарысы «Пасля раю» ад Франца СІЎКО ........ 7
«КАЛЕЙДАСКОП»: надзённыя байкі Алеся НЯЎВЕСЯ ды анонсы новых кніг ........ 8


СЛОВА

# ПАЛЯВАННЕ НА ПІСЬМЕННІКАЎ

Лявон БАРШЧЭЎСКІ

**15 верасня 1937 года «бацька народаў» Іосіф Джугашвілі-Сталін, «верны сталінец» Вячаслаў Скрабін-Молатаў і нехта начальнік 8-га аддзела Галоўнага ўпраўлення дзяржаўнай бяспекі СССР, камісар дзяржаўнай бяспекі В.Цесарскі паставілі ўласнаручныя подпісы пад чарговым расстрэльным спісам з назвай «Спіс асобаў, якія падлягаюць суду ваеннай калегіі Вярхоўнага суда Саюза ССР» пад шапкай «Беларуская ССР».**



Гэта быў рэальны чарговы дакумент таго страшнага часу — яго фотакопію, захаваную ў архіве прэзідэнта Расійскай Федэрацыі, апублікаваў даследнік сталінскага тэрору, член Саюза беларускіх пісьменнікаў Леанід Маракоў.

Характэрнасць дакумента, аднак, заключаецца ў тым, што з 103-х пералічаных у ім чалавек, забойства якіх санкцыянавалася кіраўнікамі савецкай дзяржавы і ГБ, каля двух дзесяткаў былі вядомымі ў Беларусі паэтамі, празаікамі, перакладчыкамі, драматургамі, публіцыстамі. Усе яны належалі да створанага за тры гады да таго Саюза пісьменнікаў.

У спісе, надрукаваным звычайнай друкаванай машынкай, пад нумарам 1 называўся паэт Анатоль Вольны (Ажгірэй), пад № 18 паэт, перакладчык «Жаніцьбы Фігара» Бамаршэ і Шылераўскага «Вільгельма Тэля» Алесь Дудар (Дайлідовіч), пад № 34 — паэт з Віцебшчыны Тодар Кляшторны, пад № 36 — адзін з лепшых беларускіх даваенных празаікаў, таксама народжаны на Віцебшчыне, Міхась Зарэцкі (Касянкоў), пад № 38 — паэт, драматург, шматгадовы камсамольскі і партыйны функцыянер Міхась Чарот (Кудзелька), пад № 64 — празаік, а таксама эканаміст (былы намеснік старшыні Дзяржплана БССР) Янка Нёманскі (Пятровіч), пад № 87 — мабыць, самы адораны беларускі паэт малодшага пакалення (яму ў той час было 26 гадоў, і ўжо чатыры з іх паспеў правесці ў турмах і высылцы) Юлій Таўбін...

Залішне казаць, што ў той самы час былі арыштаваныя і вывезеныя ў Казахстан, на Поўнач або ў Сібір сем'і (жонкі, дзеці, а часам — і бацькі) людзей, усё «злачынства» якіх заключалася ў тым, што Сталін некалі ўсталяваў для сваіх карных органаў план «прарэджвання» творчай інтэлігенцыі ў рэспубліках былога СССР. Адпаведныя дакументы ў апошнія гады таксама апублікаваныя. Залішне нагадваць аб тым, што для беларускіх пісьменнікаў быў складзены не адзін падобны спіс: у пачатку 1939 года жывымі і на волі ў БССР заставалася не на многа больш дзесятка паэтаў і празаікаў…

3 лютага 2010 года ў Мінску на пазачарговае пасяджэнне сабралася Рада таго самага Саюза беларускіх пісьменнікаў (СБП) — Саюза Янкі Купалы, Якуба Коласа і тых пісьменнікаў, якіх расстралялі ў 1937-м.

СБП — грамадскае аб'яднанне, перарэгістраванае ва ўсталяваным парадку міністэрствам юстыцыі Беларусі. Галоўнае пытанне позвы дня пасяджэння Рады: як абараніць амаль сотню цяперашніх членаў пісьменніцкага Саюза, якія працуюць у залежных ад дзяржаўных структур установах: часцей за ўсё выкладчыкамі ўніверсітэтаў, школьнымі настаўнікамі, супрацоўнікамі газет і часопісаў, музейнымі работнікамі. Слава Богу, пакуль гэтыя асобы не патрапілі ў «расстрэльныя» спісы. Больш чым праз 60 гадоў пасля масавага фізічнага знішчэння беларускіх пісьменнікаў да падобнага, спадзяюся, справа не дойдзе.

Але… з прыходам новага 2010 года практычна з кожным з названых членаў СБП непасрэдныя начальнікі правялі гутаркі. Калі да 5 лютага адпаведны літаратар не выйдзе з Саюза беларускіх пісьменнікаў — страціць працу. Службовыя асобы недвухсэнсоўна намякалі, што падначаленых яны выклікаюць «на ковёр» не па сваёй ініцыятыве, а па распараджэнні аднекуль «з самога верху»…

**На пазачарговае пасяджэнне сабралася Рада таго самага Саюза беларускіх пісьменнікаў (СБП) — Саюза Янкі Купалы, Якуба Коласа і тых пісьменнікаў, якіх расстралялі ў 1937-м**

Вось канкрэтная сітуацыя, якую я ведаю асабіста. Таленавітая паэтка Л.Р. жыве ў адным з невялікіх мястэчкаў пацярпелага ад Чарнобыля рэгіёна, працуе ў адзіным у мястэчку музеі і адна гадуе двух малалетніх дзяцей. Страта сённяшняга (хай і вельмі малааплочванага) месца працы паставіць сям'ю перад праблемай фізічнага выжывання, таму што ў мястэчку, як кажуць, «усе ўсіх ведаюць» і шанцаў уладкавацца нават прыбіральніцай у Л.Р. будзе няшмат.

Кажуць, што за інструкцыяй аб перaследзе членаў СБП стаіць кіраўнік нядаўна створанага (у 2006 годзе) «альтэрнатыўнага» Саюза пісьменнікаў. Той самы, які не толькі даслужыўся да генерала міліцыі, але і ўславіўся цесным супрацоўніцтвам з уладнымі структурамі. Дык вось, у яго Саюз не ўступілі, застаўшыся ў старым, «купалаўскім» Саюзе: Рыгор Барадулін, Ніл Гілевіч, Алесь Разанаў, Уладзімір Някляеў, Віктар Казько, Святлана Алексіевіч, Анатоль Вярцінскі, Уладзімір Арлоў, Васіль Сёмуха, Васіль Зуёнак; тыя, хто заўчасна, на жаль, сыйшоў у лепшы свет: Янка Брыль, Іван Навуменка, Валянцін Тарас, Ніна Мацяш. Ды і абсалютная большасць іншых, па сапраўднаму вядомых у нашай краіне літаратараў засталася вернымі традыцыям і годнасці членаў СБП.

Натуральна, генералы-чыноўнікі не павінны былі б забываць, што існуе Канстытуцыя: (артыкул 36: «Кожны мае права на свабоду аб'яднанняў...») і Закон «Аб грамадскіх аб'яднаннях» (артыкул 6: «Дзяржава гарантуе абарону правоў і законных інтарэсаў грамадскіх аб'яднанняў… Умяшанне дзяржаўных органаў і службовых асобаў у дзейнасць грамадскіх аб'яднанняў, саюзаў… не дапускаецца…», артыкул 20: «Грамадскія аб'яднанні з дня іх дзяржаўнай рэгістрацыі маюць права: ажыццяўляць дзейнасць, накіраваную на дасягненне статутных мэтаў; бесперашкодна атрымліваць і распаўсюджваць інфармацыю, якая тычыцца іх дзейнасці; карыстацца дзяржаўнымі сродкамі масай інфармацыі; абараняць правы і законныя інтарэсы… сваіх членаў, падтрымліваць сувязі з іншымі грамадскімі аб'яднаннямі...»).

Але ж «дзержимордовские» інстынкты не даюць ні жыць, ні спакойна спаць… Якая Канстытуцыя? Якія законы?! Ёсць жа Яго Вялікасць Тэлефоннае Права! І яшчэ — беспамылковае пачуццё ўласнай беспакаранасці…

Ветэран беларускага літаратурнага цэха, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі 1992 года, кавалер высокіх узнагародаў Латвіі і Нямеччыны Васіль Сёмуха — аўтар бліскучых перакладаў на беларускую Старога і Новага Запаветаў, гётаўскага «Фаўста», інтэлектуальнай паэзіі Райнера Марыі Рыльке, Аляксандра Чака, прозы Ганса Ґрымельсгаўзэна, Томаса Мана, Германа Гессэ, Фрыдрыха Ніцшэ, Вітольда Ґамбровіча. Ён распавёў мне наступную гісторыю.

Увесну мінулага года яму на хатні тэлефон патэлефанавала асоба, як яна паведаміла, «з сакратарыята Саюза пісьменнікаў» (таго, «генеральскага» — Л.Б.). Асоба выявіла выдатную дасведчанасць, нагадаўшы, што доўгія гады нявыдадзенымі застаюцца перакладзеныя Васілём Сёмухам раманы Патрыка Зюскінда, Фрыдрыха Дзюрэнмата, Штэфана Гайма, Густава Майрынка, іншыя творы сусветнай класікі. Дама падкрэсліла, што яе шэф гатовы дапамагчы пенсіянеру-літаратару не толькі ў выданні перакладаў, але і ў лепшым уладкаванні (скажу па-праўдзе, нешыкоўнага) цяперашняга побыту. Адзіная ўмова гэтага «шчасця» — выхад з СБП і ўступленне ў новы Саюз пісьменнікаў. Васіль Сёмуха заўважыў, што не бачыць неабходнасці бегаць з Саюза ў саюз, што наогул не членства ў тым альбо іншым саюзе вызначае каштоўнасць літаратара, а тым больш не членства ў саюзе, куды вабяць «пугай і пернікам»…

З абсалютным беззаконнем, калі яно пануе ў тваёй краіне, змірыцца цяжка… Калі ўлада імкнецца як мага балюча біць па годнасці нашай культуры і нацыі, чаго тады чакаць ад яе звычайнаму чалавеку? Як кажуць, «прыйдуць і за ім».

ЗГАДКА

# ПАКЛІКАНЫ ЧАСАМ

Генрых ДАЛІДОВІЧ

**...я ведаў Івана Шамякіна, бадай, найбольш з усіх ягоных равеснікаў-франтавікоў. Па працы ў часопісе «Полымя» (ён там быў пастаянным аўтарам, сябрам рэдкалегіі, дык заходзіў часта), па шматлікіх пісьменніцкіх сходах, партбюро і сакратарыяце (быў я гадоў дзесяць намеснікам сакратара партбюро ажно трох нашых «генсекаў», дык па розных клопатах меў сотні сустрэч са старшынёй Саюза пісьменнікаў і яго намеснікамі, у тым ліку і з Іванам Пятровічам) і, канечне ж, па многіх агульных сустрэчах у Саюзе пісьменнікаў, у часопісе «Маладосць», на розных выступленнях перад чытачамі, у яго дома, па часамі выпадковых і не зусім такімі спатканнях-размовах у парку імя М.Горкага, па тэлефонных перамовах.**

Ды вось сеў сказаць сваё шчырае слова пра час, у якім жыў і жыву, пра памерлых і сучаснікаў, пра яго, класіка, а яно, жаданае слова, не вельмі прарастае з думкі і гуку (бывае, перш чым напісаць, тое-сёе прамаўляю). А не прарастае, мабыць, ад ужо сталай маёй горнасці: Божа мілы, колькі іх, яшчэ далёка не старых, маладжавых і маладых, таленавітых, шчырых руплівцаў і рыцараў беларускага духу і слова, пакінула нас літаральна раптам. За нейкі дзесятак гадоў ці за паўтара яго. Калі пачнеш пералічаць іх, знаных, так патрэбных, душа беларускага болю аніяк не адпускае, а толькі агортваецца і агортваецца пачуццём велізарнай нашай страты. У сённяшніх нялёгкіх умовах гэтак жыццёва патрэбна нават іхняя такая годная і значная прысутнасць, не кажучы ўжо пра іхнія ненапісаныя творы: іх яшчэ змалку (каго ідэяй БНР, а каго ідэяй хоць марыянетачнай БССР), заварожвала жаданне чалавечай і нашай дзяржаўнай незалежнасці ды магія роднай мовы...

А ўвогуле сказаць грунтоўна пра Івана Шамякіна нялёгка: ён — вельмі няпросты. Як пісьменнік розных жанраў са своеасаблівымі складам і якасцямі, так і грамадска-дзяржаўны дзеяч, які мог на многае ў Беларусі ўплываць, меў вагу, шмат значыў ці, на жаль, услед за старэйшымі, К.Крапівой, П.Броўкам і М. Танкам, часамі змоўчваў. Нам, маладзейшым за іх, здавалася, што яны — народныя, на працягу не аднаго дзесяцігоддзя дэпутаты Вярхоўных Саветаў БССР і СССР, Героі Сацыялістычнай Працы, а М.Танк і І.Шамякін — Старшыні Вярхоўнага Савета БССР з 1963-га па 1985-ы — маглі і павінны былі больш зрабіць для Беларусі як грамадскія і дзяржаўныя дзеячы. Ды не ўсім з нас было добра вядома, што нават іхняму вялікаму папярэдніку, абкружанаму славай і дастаткам Я. Коласу не ўсё было па сіле, а яго паход у ЦК КПБ з затурбаваным лістом пра стан роднай мовы ў гэты ж дзень закончыўся смерцю...

Пра тое-сёе з тагачаснага я паспеў яшчэ запытаць у самога Івана Пятровіча ў парку, што носіць не імя Якуба Коласа, які жыў там да вайны. Зразумела, найперш пра ягонае дачыненне ў такой цяжкой справе, як узаемаадносіны з уладаю. Усе ж ведалі: як раней П.Броўка, так пазней і ён мелі доступ «наверх», маглі штосьці «выбіць». Але пад моцным ідэалагічным назіркам займацца беларускай літаратурай і пісаць сумленна, смела было вельмі складана. Гістарычную тэматыку ажно да гарбачоўскай перабудовы трэба было прабіваць з боем, ды і сучасная, асабліва з крытыкай ладу, трапляла на старонкі літвыданняў не без значных купюр. Амаль кожны паэтычны зборнік не толькі маладых, але і мэтраў павінен быў пачынацца «з вернасці» — з вершаў, прысвечаных Радзіме, партыі, Леніну альбо Вялікаму Кастрычніку. Мо і з-за гэтага многія нашыя выдатныя празаікі «заселі» на тэме «подзвігу савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне» — праўда, і там шукаючы магчымасць сказаць вялікую праўду вялікай трагедыі...

І. Шамякін першага буйнага прызнання таксама дабіўся за твор пра вайну («Глыбокая плынь»; Сталінская прэмія за 1951 год), пра тое будзе пісаць і пазней, у 1950–1980-ыя, і якасна на новым узроўні (пенталогія «Трывожнае шчасце», аповесці «Шлюбная ноч», «Гандлярка і паэт», раман «Зеніт»), але ў свядомасці многіх чытачоў ён успрымаецца найперш як пісьменнік сучаснай тэматыкі. Як беларускі Тургенеў. Ён не аднойчы прызнаваўся, што на яго змалку велізарны ўплыў зрабілі такія рэчы, як родная маляўнічая Гомельшчына, бацькава леснікоўская праца і тое, што калегі-леснікі ў іхнім доме вечарамі з вялікім захапленнем чыталі, слухалі шэдэўр беларускай паэзіі і прозы «Новую зямлю» Якуба Коласа. Сталенне ў студэнцтве прадоўжылі вайна, пасляваенная рэчаіснасць, калі ён адначасова некалькі гадоў настаўнічаў і завочна вучыўся ў Гомельскім педінстытуце. Да сучаснай тэматыкі падступіўся спачатку ў жанры апавядання, але пасля зразумеў: ягоны талент найбольш стасуецца да эпічнага жанру. Гэта і выявілася ў 1953 годзе, калі свет пабачыў ягоны раман «У добры час». Праўда, тут ён яшчэ не зусім «закруціць» сваё, шамякінскае, будзе ў рэчышчы «сацрэалізму», ухваліць у жыцці і тое, што было вартае рашучага асуджэння, але і ва ўмовах тагачаснага літаратурнага працэсу, калі ідэёлагамі ды іхнімі слугамі-крытыкамі дазваляўся толькі канфлікт «добрага з лепшым», дасць ужо яркія рэалістычныя карціны тагачаснай вёскі па прынцыпе «дазіроўкі».

Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь
Тав. Лукашэнку Аляксандру Рыгоравічу

**Паважаны Аляксандр Рыгоравіч!**

Мне восемдзесят трэці год. 56 гадоў я член Саюза пісьменнікаў Каля трох дзесяткаў гадоў з'яўляўся адным з кіраўнікоў Саюза. І, паверце, што ведаю і яго гісторыю, і асаблівасці яго дзейнасці, і яго значэнне для народа. Любому адукаванаму чалавеку вядома, што мастацкая літаратура аснова многіх галін культуры. Не кажу пра бібліятэкі. Тэатр! Не можа ён ставіць толькі Шэкспіра, Мальера, Астроўскага. Яму трэба сучасная драматургія! Кампазітарам патрэбны тэксты песень, лібрэта опер. Кінасцэнарыі. Ды і жывапіс, графіка без літаратуры былі б далёкія ад жыцця народа.

Нарэшце мастацкія творы – самая даходлівая форма ідэалогіі, пра што мы забываем. Сама гісторыя краіны, народа лепш даходзіць да моладзі, дзяцей праз мастацкія творы. Хто чытаў бы 4-х томную гісторыю вайны 1812 года? А "Вайну і мір" усе мы прачыталі. І не адзін раз! Ці "Ціхі дон" Эпапея грамадзянскай вайны! А нашы раманы, аповесці, драмы, паэмы пра гераізм народа ў Вялікай Айчыннай вайне!

Прашу прабачыць за агульнавядомыя ісціны. Магу дадаць выказванне класіка. літаратура – летапіс эпохі.

Але творца не можа быць у адзіноце. Толькі на зары хрысціянства манахі ў адзіноце перапісвалі "Біблію", перакладалі на мову сваіх народаў Скарына ўжо не быў адзінокі.

Пры з'яўленні свецкай літаратуры ўзніклі і аб'яднанні мастакоў у розных формах са старажытнай Грэцыі і Рыма. Геній Пушкіна стварыў кола літаратараў Утварэнне ў 1932-34 Саюза савецкіх пісьменнікаў СССР была найлепшай формай аб'яднання літаратараў, якія гатовы былі словам сваім служыць народу І партыйныя, савецкія органы аказвалі Саюзу ідэалагічную і матэрыяльную падтрымку

Упэўнены, што разумна знойдзеная форма аб'яднання творчых работнікаў Саюзы пісьменнікаў, мастакоў, кампазітараў, журналістаў не ўстарэла, не аджыла.

Але мяне хвалюе лёс Саюза пісьменнікаў. Апошнія гады ён быў на грані развала. Уцёкі за мяжу старшыні Някляева, блытаная палітыка Іпатавай, "інтэрвенцыя" пен-клуба, каманды некаторых з тых, хто сядзеў за бугром і карміўся з касы пен-клуба, трохі не развалілі нашу вялікую і на 70-80% патрыятычную арганізацыю.

Паўгода назад адбыўся з'езд СП. Памянялася кіраўніцтва. Старшынёй выбралі 30-гадовага актыўнага літаратара, адукаванага чалавека (ён доктар навук) Алеся Пашкевіча. Я ведаю яго. Чалавек разумны. Кіраўнік з яго атрымаецца, калі яму дапамагчы. Без дапамогі правал. Нельга кіраваць саюзам творцаў у 500 чалавек, не маючы ніякага штата. Саюз, кожны член яго, можа пісаць кнігі, але арганізацыя не камерцыйная структура. грошы зарабіць не можа. Жыццё ў Саюзе пісьменнікаў замірае, не адказвае ніводзін тэлефон, няма сакратара-справавода. Увесь час СП фінансавала дзяржава. Не трэба 20 штатных адзінак, як было. Але 8-10 – абавязкова трэба! Штатныя: старшыня, або яго намеснік, адказны сакратар (арганізатар усіх мерапрыемстваў), два кансультанты (сотні маладых шлюць на водзыў свае творы), кансультант па абласных аддзяленнях, сакратар-справавод, тэхработнік.

Аляксандр Рыгоравіч! Трэба мізэрная сума у многаміліярдным бюджэце. А вынік будзе! Я не сумняваюся. Кніга роўная адной "Новай зямлі" будзе жыць стагоддзі, як і Коласава. Ці новая "Палеская трылогія", роўная па мастацкай якасці трылогіі Мележа. Дзесяць тамоў паэзіі Максіма Танка! А ёсць паэты, якія пакінуць такую спадчыну! Народ наш таленавіты. І нашчадкі нашы будуць ганарыцца такім багаццем! І скажуць добрыя словы падзякі тым, хто памог з'явіцца такім мастацкім скарбам!

Прашу Вас ад імя ўсіх пісьменнікаў· даць каманду Мінфіну не скупіцца на літаратуру, на мастацкія шэдэўры. З'яднанне паўтысячы чалавек, якім бог даў талент, дзяржава адукацыю, – гэта ж цэлая армія. Падтрымаць яе матэрыяльна і ідэалагічна пачэсная задача Кіраўніцтва Дзяржавы і наша ветэранаў літаратуры.

Многія мае калегі наказвалі папрасіць вярнуць Дом літаратараў Саюзу пісьменнікаў Гэта вырашыла б і матэрыяльныя, і многія творчыя праблемы. Савецкая ўлада будавала Дом для пісьменнікаў

Спадзяемся на Вашу любоў да мастацкага слова. Зрабіце ласку, памажыце нашай творчай арганізацыі. Будзем глыбока ўдзячныя.

З пажаданнем выдатных поспехаў у Вашай пачэснай адказнай працы Прэзідэнта Рэспублікі.

Іван Шамякін,
народны пісьменнік РБ,
Лаўрэат прэміі Саюзнай
дзяржавы Беларусь-Расія.

Май 2003 г

Тое, што І. Шамякін змоладу знаўся з «вышэйшымі сферамі» (вучоба ў партшколе, сустрэчы з кіраўнікамі «сярэдняй рукі»), а пасля здолеў хадзіць і «наверх», трапіць у розныя высокія выбарныя савецкія і партыйныя органы, ён, безумоўна, спажыў удала. Гэта дало яму шанец спазнаць недаступную для простых смяротных «вышэйшую» думку, учуць подых свежых перамен і своечасова з'арыентавацца на новы твор, які можа выклікаць усеагульную цікавасць. Скажам, да 1956-га ўжо рэзка скараціўся хваласпеў «бацьку ўсіх народаў», але яшчэ яго цараванне не было асуджана як праява «культу асобы» са страшэннымі вынікамі. І вось менавіта ўжо ў 1956-м І.Шамякін знаёміць чытача з раманам «Крыніцы» (раман жа не пішацца за адну ноч, ствараўся мо не меней года), дзе аўтар пасля рамана «У добры час» не толькі паглыбіўся ў адлюстраванне стану тагачаснага грамадства, становішча і псіхалогію розных яго слаёў, але паказаў і рознабаковыя заганы сталінізму, калі слова разыходзіцца са справай, калі цэніцца не столькі чалавечыя талент і годнасць, а ўгодлівае выкананне розных вульгарных пастаноў ды інструкцый. Твор, мала сказаць, выклікаў вялікую цікавасць — кожнага па-свойму ўразіў. І на ранейшыя яго творы было нямала рэцэнзій, а на гэты літаральна пасыпаліся ў самых розных выданнях. Раман ухваліў і А.Адамовіч, якога тады пачыналі называць «дэгустатарам» беларускай прозы. Мо і з «Крыніц» І.Шамякін становіцца адным з самых чытэльных пісьменнікаў. І не толькі ў нас. Хоць яму не выпала быць доўга ў прозе ў гордай адзіноце: пачынаюць набіраць творчую моц Я.Брыль, І.Мележ, В.Быкаў, а крыху пазней — і У.Караткевіч, яшчэ маладзейшыя.

Набыты творчы поспех замацуе раман «Сэрца на далоні» (1963), у якім адбудзецца яшчэ большае паглыбленне ў рэчаіснасць і будзе ўдасканалена пісьменніцкае майстэрства. Бывае, твор на сучасную тэму тут жа становіцца модным, але прачытваць яго другі раз не хочацца: яго пеністасць так і засталася часовай, сплыла з вадою. «Сэрца на далоні», як і «Трывожнае шчасце», «Крыніцы» вабіць перачытаць і цяпер: і сёння не лішняя турбота за маральнае здароўе грамадства і кожнага чалавека паасобку, за здаровы лад жыцця, за шчырыя і сумленныя паводзіны і працу, за пазбаўленне ад абыякавасці і разліковага кар'eрызму, ад занядбання вялікіх народных каштоўнасцяў і страху праявіць сваё сапраўднае Я дзеля іх абароны. А што датычыць літаратурных здабыткаў, то ў «Сэрцы на далоні» І.Шамякін стаў сапраўдным майстрам сюжэту і кампазіцыі, у добрым сэнсе інтрыгі, што не дасць чытачу жадання адкласці кнігу недачытанай. А разам з гэтым пачала шліфавацца ягоная моўная палітра: калі раней мог дазваляць сабе нярэдка ўжываць канцылярска-газетную лексіку, то цяпер пераадольваў гэтую спакусу, шукаў сярод лексічнай разнастастайнасці яркае моўна-выяўленчае, даючы слову мастацкую, псіхалагічную і эстэтычную моц. У гэтым сэнсе ён даў выдатны ўзор, які зусім не зашкодзіць вывучаць і цяпер маладым пісьменнікам: спасціжэнне рабочай лабараторнай школы асваення, падачы матэрыяла ў высокапрафесійным, вельмі цікавым, займальным выкананні.

Маючы шмат розных пасадаў і абавязкаў, удзельнічаючы ў розных патрэбных і не зусім пасяджэннях, І.Шамякін умеў і шмат пісаць. Як па-ранейшаму «тургенеўскае» (раманы «Снежныя зімы», «Атланты і карыятыды», «Вазьму твой боль», «Злая зорка» і інш.), так і, як у свой час гаварылася, на гісторыка-рэвалюцыйную тэму (аповесці «Першы генерал» і «Браняпоезд «Таварыш Ленін»» , раман «Петраград-Брэст»), на гістарычную (раман «Вялікая княгіня»). А да гэтага колькі напісана п'ес, успамінаў і артыкулаў, сцэнарыяў!

Мне асабіста прыемна, што Іван Пятровіч у апошняе дзесяцігоддзе жыцця ўпадабаў друкавацца ў «Маладосці», дзе быў я намеснікам галоўнага рэдактара, а затым галоўным. Некаторыя калегі рабілі мне закіды, што падтрымліваю яго «настальгію па былым, уладкаваным жыцці, непрыйманне перабудовы» і г.д. Лічыў і лічу, што і новыя яго творы («Ахвяры», «Аповесці Івана Андрэевіча», «Падзенне» і інш.) таксама надзённыя, вострасюжэтныя і патрэбныя: у іх не толькі ўздыхі па слаўным мінулым, але і жывы боль за непачцівасць да старэйшага пакалення і за многае зробленае ім годна, за страту высокай маралі, з-за чаго матэрыяльныя каштоўнасці пераважаюць над духоўнасцю.

...Яшчэ пра паходы Івана Пятровіча «наверх». Не варта лічыць, што ён у савецкі час хадзіў туды толькі для таго, каб нешта займець найперш для сябе. Тое, што ён меў, натуральна дасталося яму па праве зробленага, што было дасягненнем і ўсёй беларускай літаратуры. Ён стукаўся ў дзверы высокіх цэкоўскіх і саўмінаўскіх кабінетаў і з іншымі турботамі. Пра падтрымку дзейнасці Саюза пісьменнікаў і Дома літаратара, выдавецтваў «Мастацкая літаратура», «Юнацтва» і «Беларускай энцыклапедыі», літаратурных часопісаў. А хто з нас можа заявіць, што Іван Пятровіч, быўшы адным з кіраўнікоў Саюза пісьменнікаў, не паспрыяў нам, не аднаму дзесятку маладых, атрымаць для жыцця і творчай працы кватэру?! Ці, магчы знацца з самымі вядомымі людзьмі краіны, каго яшчэ малазнанага пакрыўдзіў няўважлівасцю і нетактоўнасцю?! А хіба не перажываў шчыра і занепакоена, што новае пакаленне чынавенства дазволіла сабе звысоку глядзець на літаратурную справу і на сапраўдных майстроў яе, а часамі і дапускаць пагарду і знявагу, прыгалубліваць нібыта надзейных шарачкоў, якія паімкнуліся не толькі падняць галовы, але і ўхапіць для сябе тое, што ім, шарачкам, не можа належыць?!

На жаль, у апошнія гады жыцця Івана Шамякіна нашыя новыя «гаспадары» з ім, Асобай, палічылі за лепшае не лічыцца. А ён, ужо хворы, прытомлены, усё роўна не мог не выяўляць лепшых сваіх і грамадзянскіх якасцей, намагаўся — найбольш праз прэсу, — хацеў дастукацца да іхніх кабінетаў, паразумецца. І не па дробязях. А як пажылы і вядомы чалавек — па турботах пра асноватворнае для нашай маладой незалежнай краіны. І ў гэтым асноватворным ён бачыў неперахоДнае вялікае значэнне ролі менавіта беларускіх пісьменнікаў, за лёс якіх Ён, Класік, не мог не хвалявацца, клапоцячыся пра нашую агульную будучыню... Адпаведна, сярод шырокіх слаёў нашага грамадства ён не можа не ўспамінацца светла ды пачціва...

ФРЭСКІ

# ТАЕМНАСЦЬ

Барыс ПЯТРОВІЧ

## Душа

лязо ляжала ля труны, пускаючы люстэркавым бокам сонечнага «зайчыка» ў столь, і ён, як і любы зайчык, падрогваў, трымцеў ці то ад страху, ці мо ад таго, што недзе глыбока пад зямлёю час ад часу праносіліся цягнікі метро; святло падала з акна на лязо — сонца паціху рухалася ад абеду на вечар, на спачын, і разам з ім рухаўся «зайчык», пакуль святло вакна не саскочыла на падлогу — тады знік і «зайчык»… «усё, пачынаем…» — сказаў нехта, і пад дужымі рукамі труна закоўзалася на зэдліках і скінула сваім целам лязо на падлогу, у асветлены простакутнік; «зайчык» ажыў, зноў скокнуў на столь і пачаў там таньчыць свой рытуальны танец — цяпер ужо так смела і разняволена, што падумалася — гэта таньчыць вызваленая нарэшце з няволі душа; пакой між тым апусцеў, засталіся толькі крэслы, засланыя тканымі ручнікамі, на якіх белы колер перамяжаўся з чырвоным і перамагаў бліжэй да сярэдзіны… у пустым пакоі «зайчык» перастаў здавацца жывым і патрэбным, рухавасць ягонaя цяпер толькі назаляла і замінала адпачываць стомленаму ад людское мітусні маленькаму коціку, які раней, падобна, не заўважаў увогуле гэтага зайчыка, што апусціўся ўжо са стале на сцяну і паступова набліжаўся да даступнай коціку вышыні; коцік ляжаў, хітра прыплюшчыўшы вочы — так, каб увесь час назіраць за зайчыкам, які і блізка ні пра што не здагадваўся, а проста падпарадкоўваўся сонцу, што ішло на адпачынак; і вось надышоў момант, калі зайчык апынуўся на патрэбнай коціку вышыні — імклівы скачок — і зайчыка не стала… але і ў лапах коціка нічога не было: коцік расчаравана вярнуўся на нагрэтае раней месца і, ужо самотна заплюшчваючы вочы, убачыў, што зайчык зноў быў на той самай сцяне — імклівы скачок — і зноўку ў лапах нічога няма, і сцяна таксама пустая, бо зайчык апынуўся на коцікавым целе, але коцік яго не бачыў… гэтым разам коцік вырашыў не зыходзіць з месца, а дачакацца зайчыка; і, вядома ж, не дачакаўся, бо тут у пакой вярнуліся заклапочаныя нечым людзі, рассунулі зэдлікі, унеслі стол, селі вакол яго; лязо апынулася глыбока пад сталом, недасягальнае для сонца, і толькі цяпер сталі заўважныя на ім плямкі — цені засохлай крыві…

## Таемнасць

калі прыходзіць зіма — дрэвы распранаюцца, і нам, чалавекам, няўцям — навошта яны гэта робяць, бо мы якраз пачынаем апранацца цяплей: няўжо прырода здурэла?

калі мы кладземся спаць — мы распранаемся… няўжо ўсё так проста вытлумачваецца?

не веру… самому сабе не веру, тым болей — прыродзе: не можа яна быць такой прымітыўнай, як я, як мы

за гэтым хаваецца нейкі таемны сэнс, да якога мне, нам не дамкнуць…

бо самае простае — насамрэч ёсць самае складанае, бо ўсё самае лагічнае — ёсць самае абсурднае… і наадварот…

дрэвы распранаюцца ўвосень штогод, як мы перад сном, але і для іх урэшце ўсё скончыцца апошнім распрананнем…

так робяць дрэвы

а мы прыходзім у гэты свет голымі, а сыходзім апранутымі…

нешта тут не так… ці правільна гэта? ці разумна?..

не трэба саромецца свайго цела, не трэба саромецца самога сябе

як не саромеюцца дрэвы, распранаючыся перад немінучым

як не саромеемся мы, прыходзячы ў гэты свет

## Мора

людзі, якія маюць мора побач, нават і не ўяўляюць, як важна мець мора

людзі, якія маюць мора пры сваёй зямлі, нават і не задумваюцца, як добра мець мора, бо не ўяўляюць, што яго можа не быць…

а мора — яно вось, яно лашчыцца ля ног у ціхае надвор'е і цяжка варочаецца, грукае ў бераг, калі вецер раптам узбунтуецца

я люблю мора ціхае — як возера

але калі б яно было заўсёды ціхім — яно было б нецікавым, а можа, і… непатрэбным для плавання, як не трэба балота

чалавек ад нараджэння павінен баяцца вады, як баіцца агню, але чаму тады ён селіцца найперш каля рэк і азёраў, каля мораў — спачатку ля тых, якія ніколі не замярзаюць і не ўтвараюць мастоў і дарог

замерзлая вада — ужо не вада, а лёд — які спакайней за любое балота

шляхі скарачаюцца, і па моры (па рацэ) прайсці можна, як па суху, адно хіба — не босымі нагамі

мора любіць смелых, горы любяць смелых…

не паверыце, але і балота любіць смелых ды адчайных

аднак — мора смелых робіць смялейшымі, а балота забірае іх сабе і не адпускае

бяда нашая — мора, што стала балотам…

## Родная мова

мама спявала мне песню — не калыханку, а — пра мяцеліцу, што замяла ўсе дарожкі да млага… так міла было, так соладка слухаць, што спаць зусім не хацелася…

мне чатыры гады, на вуліцы люты — студзёна, завіруха завіхаецца, сцелецца ўздоўж платоў, перамятае іерогліфы сняжынак з усходу на захад і з поўдня на поўнач, на шыбах мяккі аксамітны холад-шэрань шэрых малюнкаў Дзеда Мароза — усё больш экзатычныя: пальмы ды пальмы… можна пахукаць на іх і займець між шырокага лісця вакенца ў жыццё, дзе завіруха мяце, замятае ўсе дарожкі дробнымі літаркамі сняжынак…

хвіліна — і вакенца мае мутнее, заплывае лядком, і мне зноў робіцца цесна-цесна ў хаце; а ўчора ранкам мяне падвучылі лізнуць халодную клямку: язык мой прыліп да яе, і доўга стаяў я так, пакуль не адважыўся ірвануць язык…

Самае простае — насамрэч ёсць самае складанае, бо ўсё самае лагічнае — ёсць самае абсурднае… і наадварот…



Фота Рычардса С.

ружовая скурка скурчылася на клямцы і пасінела, а рот напоўніўся салёнай крывёй, і шчокі заірдзелі гарачымі слязьмі…

цяпер гарбаты нават не папіць — язык сцяўся ад болю, і песню за мамаю не падпець — балюча б'ецца язык аб зубы: словы маміны патанаюць і патухаюць у галаве,

каб застацца ў памяці маёй назаўсёды

## Сон-сну-сном…

сон працярушвае, працярэблівае сабе дарогу з учора ў сёння, а ночы, як не было

сон-прабел, сон-адбіўка між тым, што было і што будзе

няспешны гэтакі сон, які праляпае імгнення: здаецца, толькі прылёг сёння, а расплюшчыў вочы — ужо заўтра, альбо новае сёння

кожная хвіліна яшчэ памятаецца, жанчына, што побач, раскрылася ў сне; вось яна — нерухомая, як на фотаздымку, і можна любавацца кожным яе запаволеным уздыхам — як пашыраюцца ноздры, як падымаюцца грудзі

няма нічога ў свеце прыгажэй за жанчыну, якая спіць — за ёю можна назіраць бясконца, пакуль яна, нібыта адчуваючы твой погляд, не прачнецца… размружыць вочы і, яшчэ не ўцяміўшы, што робіць, пачне прыкрываць аголенае ў сне

сорам прачынаецца раней за розум

вось яно, чалавечае, што перамагло ў нас жывёльнае

сорам — першае, што страціць чалавек апошнім

розум — апошняе, што страціць чалавек першым

адзінае, што застанецца чалавеку ад чалавека — толькі сны; яны будуць належыць нам вечна — нетаропкія сны з учора ў заўтра, няспешныя сны з сёння ў сёння

## Малёк

выпнутае, поўнае, як вока, возера моўчкі выцякала ў раку

моўчкі — так здавалася здалёку, а зблізку возера цурчэла струмянём, які падаў уніз тонкім вадаспадзікам: вада білася аб камяні на доле, і ейны крык і быў адзіным знакам пра тое, што ўсё вакол яшчэ жыве, нягледзячы на познюю, дрэваголую восень

я спыніўся ля вадаспадзіку, перад якім знешне спакойная вада раптам набірала адчайную хуткасць, уцягваючы ў сваю плынь нябачныя раней парушынкі і трэсачкі, і стараючыся захапіць малька нейкае рыбінкі, што з усіх сваіх малых сілаў супраціўляўся цячэнню, трапятаў воблачкамі плаўнікоў, але не адплываў, а стаяў на месцы

і тады я вырашыў дапамагчы яму — спалохаць малька і тым дадаць яму сілаў, каб ён адплыў адсюль, каб не ўцягнула яго ў сябе плынь і не скінула з небяспечнае вышыні на камяні… і толькі хацеў зрабіць гэта, як падумаў раптам: а можа, яму акурат так тут і цяпер добра, можа, яму нічога не пагражае і ён у любы момант здольны сам адплыць, можа, ён проста гуляецца з плынню і раскашуе ў шчасці існавання

і — змагання…



Фота Алеся Сачанкі

▸ **ВЕРШЫ**

Генадзь БУРАЎКІН

# З КНІГІ «ЛІСТЫ ДА ЗАПАТРАБАВАННЯ»

***

*Калі нянавісць просіцца ў радкі*
*І сэрца рвуць няўдачы і згрызоты,*
*Я пакідаю*
*Дом свой гарадскі,*
*Шукаю цішыні і адзіноты.*

*І вось,*
*Здаецца,*
*Ад усіх уцёк,*
*Змог ад штодзённых звадаў зачыніцца…*
*Але ў вакно мне стукае*
*Жыццё*
*Галінкай бэзу,*
*Дзюбкаю сініцы.*

*Яно мне не дае ў глухой цішы*
*Схавацца ў цемры*
*І на ўсё забыцца,*
*Зняверанымі самотнікам зрабіцца*
*І моўчкі бавіць дні свае,*
*Як быццам*
*На выспе ў першабытным шалашы.*

*Яно не адпускае ад сябе*
*Халодным ветрам*
*І дажджом кроплістым,*
*Ядлоўцам і дубком зеленалістым,*
*Рыданнем кані*
*І шпачыным свістам,*
*І зоркамі,*
*Што свецяцца ў журбе.*

*І колькі б я аб шчасці не маліў,*
*Як з горкаю нудой не разлучаўся б —*
*Жыць давядзецца ў гэтым смутным часе,*
*На гэтай неўладкаванай зямлі…*

***

*Божа мой,*
*Як лёталі мы ў марах —*
*Сёння і не ўспомніць ані блізка.*
*Хіба што ў журботных мемуарах*
*Рыпнуць,*
*Як вячэрняя калыска.*

*Выраслі даўно,*
*Працверазелі,*
*Памудрэлі,*
*Сталі асцярожныя.*
*Ад наіву вылечыла зелле —*
*Палыны сівыя,*
*Прыдарожныя.*

*Толькі і цяпер*
*Начамі мучае*
*У гадоў бязлітаснай аблозе*
*Самае святое і балючае,*
*Што дагэтуль так і не збылося…*

***

*Вось і неба раіцца са мною,*
*Сыпле зоркі ў прыгаршчы мае.*
*І ўздыхае глуха за спіною*
*Хвойнік,*
*Што сцяною паўстае.*

*Чым мне ад няшчасцяў засланіцца,*
*Дзе прычаліць лёсу карабель?*
*Адляцела ўжо мая сініца,*
*Затрымаўся недзе жураўель.*

*Мару я аб прыстані далёкай,*
*Аб лагодным шуме чаратоў.*
*І шукаю*
*Невідушчым вокам*
*Сцежку да пахіленых жытоў…*

## Сонейка незакатнае

***1***

*Ты прачынаешся —*
*І для мяне ўзыходзіць сонейка,*


Фота Сяргея Шапрана

*Залатое,*
*Вясёлае,*
*Ласкавае.*
*І яно запаўняе сабою*
*Яшчэ сонны пакой*
*І маё трапяткое сэрца.*
*Русым вадаспадам промняў*
*На плечы твае абрынаюцца валасы,*
*Як ластаўчыны крылы,*
*Пад імі ўскідваюцца бровы —*
*І ўсё вакол робіцца*
*Разняволеным,*
*Цёплым*
*І родным.*

*Я сцішана грэюся каля твайго*
*загадкавага святла,*
*Пакуль ты*
*Заплятаеш косы*
*І фарбуеш вусны,*
*Выбіраеш сукенку,*
*Шукаеш чаравічкі.*

*Я не хачу цябе адпускаць,*
*Бо без цябе мне будзе*
*Халадна,*
*Сумна*
*І змрочна.*

*Але я ведаю,*
*Што сонца*
*Павінна свяціць усім,*
*Не толькі мне аднаму.*
*І я праводжу цябе да дзвярэй,*
*Цалую на развітанне*
*І доўга гляджу ўслед.*

*Я цяпер ведаю,*
*Як пахне сонца –*
*Тваімі духамі і памадай,*
*Чым яно пазвоньвае ў цішыні —*
*Тваімі ключамі,*
*Як таропка цокае па тратуары —*
*Тваімі абцасікамі…*
*Ты — маё сонейка.*

***2***
*Божа мой,*
*Колькі клопатаў сыплецца на мяне*
*з усіх бакоў —*
*Паперы,*
*Тэлефонныя званкі,*
*Наведвальнікі,*
*Просьбы,*
*Загады,*
*Парады,*
*Даручэнні,*
*Паведамленні!..*

*І ўсё —*
*Абавязковае,*
*Тэрміновае,*
*Неадкладнае,*
*Падрабязнае,*
*Дакладнае…*
*Ад сяброў,*
*Ад калег,*
*Ад начальства…*
*І я*
*Кручуся,*
*Лаюся,*
*Махаю рукамі,*
*Хапаюся за сэрца,*
*Знясілена падаю на крэсла.*
*У мяне пагрозліва цямнее ў вачах.*

*І тут —*
*Як збавенне,*
*Як голас неба,*
*Твой тэлефонны званок:*
*«А ці паабедаў ты?»*

*Сонейка,*
*Пра якое я забыўся,*
*Зноў выбліснула з-за хмар*
*І агарнула мяне ласкай,*
*І прагнала адчай,*
*І прамыла мне вочы святлом.*

*Ты ёсць!*
*Ты думаеш пра мяне!*
*Ты хвалюешся.*
*Ты — побач.*

*Сонейка маё…*

***3***
*Па ацішэлых вуліцах*
*Нясу дадому*
*Стомленасць,*
*Неадчэпныя клопаты,*
*Пакутлівую незадаволенасць сабой*
*І цяжкі ад недачытаных кніжак партфель.*
*Не звяртаю ўвагу*
*На паспешлівых мінакоў,*
*На перапоўненыя аўтобусы,*
*На пахаладнелы вецер*
*І лёгкае шэрае сутонне.*

*Хочацца як хутчэй*
*Трапіць дадому,*
*Скінуць чаравікі,*
*Адшпурнуць партфель*
*І ўлегчыся на канапу,*
*Аддаючыся спакою і прыцемку.*

*Але насустрач выходзіш ты,*
*Усмешлівая і прыгожая —*
*І я забываюся на ўсё,*
*І хапаю цябе на рукі,*
*І, як на нашым першым спатканні,*
*Нясмела і нязграбна*
*Тулюся да цябе,*
*І не хачу апускаць на зямлю,*
*І слепну ад тваіх гарэзных вачэй,*
*Патанаю ў тваім гарачым дыханні…*

*За вокнамі — змрок,*
*На двары — вечар.*
*Але гэта —*
*Для іншых,*
*Змарнелых і няшчасных,*
*Зняверaных і адзінокіх.*

*А ў мяне на руках —*
*Загадкавае і чаканае,*
*Захмеленае і праменнае*
*Маё сонейка…*

***4***

*Твая галава — на маім плячы.*
*Твая далонька — пад маёй шчакою.*
*Ля маіх вуснаў — твая скроня*
*З ціхаю спалоханай жылкаю.*

*Я паволі адплываю ў сон,*
*У наша юнацтва —*
*Пад нашы шапатлівыя бярозы,*
*Да нашых верасовых сцежак,*
*Да нашых наіўных клятваў,*
*У нашу веснавую памяць.*

*Ты таксама плывеш побач.*
*І даверліва працягваеш да мяне руку,*
*І дазваляеш акунуцца ў паводку*
*Тваіх духмяных валасоў*
*І вуснамі знайсці твае салодкія вусны…*

*І ўсё цямнее,*
*Знікае,*
*І зямля выплывае з-пад ног,*
*І ў грудзях ашалела грукае сэрца…*

*Ды раптам —*
*Праз сон —*
*Ты ўскрыкваеш.*
*І я ўсхопліваюся,*
*І мяне аблівае пяшчотай*
*І густой незямной цеплынёй…*
*Ты нікуды не падзелася.*
*Ты — ёсць,*
*Ты — побач,*
*Ты — са мной,*
*Сонейка маё незакатнае!..*

***

*Павуцінку*
*Сівізною ранняй*
*Скінулі нам з неба жураўлі.*
*Спадзяванняў*
*І расчараванняў*
*Столькі мы з табой пражылі!*

*Мы цяпер жывём у добрым ладзе.*
*Крыўды ўсе забыліся.*
*Але ж*
*Ні адной маршчынкі не разгладзіш,*
*Ні адной слязінкі не сатрэш…*

***

*Бурліць,*
*Шуміць,*
*Пяе юнацтва,*
*Як млын з вірліваю вадой…*
*Ах, як хацелася б угнацца*
*Мне за паводкай маладой!*

*Вядома,*
*Сілы ўжо не тыя,*
*Не той запал,*
*Не той імпэт.*
*І ў храме — новыя святыя,*
*І ў садзе — новых яблынь цвет.*

*Ды хай паможа мне Ўсявышні,*
*Каб у юнацкай гамане*
*Быў голас мой*
*Зусім не лішні*
*І свой пасад*
*Быў у мяне…*

**АПАВЯДАННЕ**

# КАПЕШАЧКА

Уладзімір МІХНО



Капешачка прастаяла паўлета. Учарнела, збуцьвела, дзе-нідзе нават зверху сена пакрылася шэраю плесенню, а што рабілася ўсярэдзіне, ведаць адной ёй, бо ўжо не магла ўздыхнуць на поўныя грудзі. Ледзьве спрабавала захапіць паветра разам са свежым ветрыкам, які парывамі тузаў-казытаў яе, імкнучыся вярнуць да жыцця, як раптам з сярэдзіны вырываўся цэлы стаўпень перапрэлае трухі. Задыхаючыся, капешачка асядала яшчэ ніжай. Нехта звыш як бы дыктаваў ёй: сядзі і не рыпайся, ведай сваё месца на гэтым маленькім лапіку зямлі. Страшна, балюча было глядзець на капешачку. Страшна і — няёмка. Гэтак часам глядзіш на безнадзейна хворага чалавека, у адначассе жахаючыся, спачуваеш і адчуваеш нібы віну перад ім. Хаця хто ж вінаваты, што чалавек смяротна захварэў?

Клевярок касіў Геля яшчэ перад Сёмухай. Тройца сёлета хоць і позняя была, прыпадала недзе напрыканцы чэрвеня, ды, самі падумайце, зараз ужо заканчваўся жнівень. За возерам ваўсю грукацеў камбайн, можна сказаць, адзін жывы на ўсю гаспадарку. І дзень і ноч грукацеў. Камбайну было загадана «высочайшим указом» скончыць жніво да Прачыстай, вось і стараўся. Дарэмна вылузваўся са скуры. Вышэй сябе не скочыш, хай нават табою ву-унь якія мудрыя начальнікі апякуюцца. Адзін у полі не воін. Жнівень пакуль што выстаяў у сухмені. Богу, пэўна, надакучыла паліваць зямельку — падаўся на вакацыі. Ліло, дзе гусцей, дзе цішэй, чатыры месяцы запар. Як толькі снег сышоў напрадвесні, так неба і прасіцілася. Не маглі ўзлезці на ніву, пасеяць, дый касілі-сушылі, выкрадаючы ў Бога кожную сухую хвілінку, якіх сёлета можна на пальцы спячы. У жніўні апагодзілася і трэба было ірваць жылы, каб нешта ў пуню ўкінуць.

Трэба, але каму ірвацца? Геля нешта не заўважаў, каб у вёсцы хтосьці браў на пуп. Унукі вунь да паўдня адсыпаюцца, пасля дасыта набіваюць шлунак, апантана пялешчуцца ў возеры, адмыцца не могуць, як бы хто з іх на малатарні за ноч запокаўся. Варушыцца пачынаюць толькі адвячоркам, абчапаўшыся бліскучымі мабільнымі тэлефонамі ды бессаромнымі дзеўкамі, якія самі прыстаюць да штаноў, як сучкі ў дзядоўніку. І ночачку маладыя «малоцяць» — у паўпустых паветках ды на паўголых сенавалах. Аж трэтар ідзе. Ці блындаюць па вясковай вуліцы, было ўжо, заціхшай, ды зноў аджыўшай улетку. Дзе ж пасля той «малатарні» ўраніцы возьмешся за касу! Ды якая касьба?! Ці ведаюць гарадскія ўнукі, як да тае касы падступіцца? Не спяшаюцца на поплаў і свае, вясковыя дзецюкі, каму гадоў па сорак. Трэба палечыць зранку галаву, вось і рупяцца, шчыруюць: калі хто ўначы дошку якую не сцягнуў у калгасе, не прадаў, то хоць бутэльку пустую знайсці пад плотам, ды ў магазін — прасіцца, напрамілы бог, напавер, да крамшчыцы ў доўг, бо «трубы гараць». А там, глядзіш, «лячэнне» зацягваецца і да вечара, гледзячы якія ў каго «трубы» і як багата тых «лекаў»... Каровы ў вёсцы пазбывалі. Калі засталося штук пяць — на развод. Захацеўшы, у магазіне можна малака купіць, якога заўгодна. У вёсцы ж таксама не ўсе дурні, вось і пралічылі, не выгадна карова, бо не ты яе маеш, а яна цябе... Няма каму касіць, і няма каго карміць. Луг за возерам, каторае лета чакаючы, ды так і не прычакаўшы касцоў, здзічэў. Дзіччу ж пазарастала і бальшыня сваіх агародаў. Людзі махнулі рукою і забыліся пра той клопат.

І толькі Геля ніяк не хоча, не жадае змірыцца, што ў яго будзе пад вокнамі дзядоўнік расці. Мужык ён яшчэ, разабраўшыся, і не стары, крышачку за шэсцьдзесят натупаў, ды ногі перасталі цвёрда ступаць па зямлі, а рукі адмаўляюцца слухацца. І каб жа гарэлачку папіваў ды перагарэў, мо не так крыўдна было б, а то змалку нос ад яе вярнуў. Іншыя вунь чорныя, як галавешкі, лостам па зямельцы валяюцца, і холад іх не бярэ, і чорт ім не страшны. Праспіртаваліся, то і на тым свеце, мусіць, як муміі ляжаць будуць, век не сатлеюць. А тут, халера цябе ведае, не піў, не курыў ніколі і здароўя не меў, не меў і шчасця. Позна ажаніўся, рана аўдавеў, дый дзяцей Бог не даў. Мусіць, для кожнага ў жыцці сваю сцяжыну Бог прыпасае. А толькі ні разу Геля не паляжаў проці дня на канапе, лыткі пад столь задраўшы. То тут яму не так, то там не гэдак. Бачаць вочы няўходжанае-недагледжанае і гоняць чалавека ці на агарод, ці на падворак, ці ў дрывотнік, ці на пожаньку. Кароўку-карміцельку да апошняга Геля трымаў. Як жа без яе! Бывала, сноўдаюць з бабаю да цёмнага: косяць, сушаць, падграбаюць, у капешачкі складваюць, цягаюць у пуню. А сена далёка. Даўней жа на сваіх агародах травы мала сеялі, усё бульбу, каб і свінням на зіму хапіла, а сена імкнуліся настарацца так дзе. Крышачку ў калгасе на малако дадуць, недзе каля кустоў адкрадзеш-адкосіш атавы ўперамешку з асокаю. Патрымаў яшчэ Геля кароўку і пасля, калі ўжо гаспадыні не стала. За тое ў вёсцы з яго латругі пацвельваліся: хто кулаком зваў, а хто і дурнем. Бо хіба толькі дурань сёння за кароўчын хвост трымаецца ды яшчэ й капітал на тым зрабіць імкнецца. Такі кулак, што грошай жменька...

З тога часу і яго агарод, хай сабе і невялічкі быў, таксама звёўся. Не было яму каго болей карміць. Бульбы Геля даўно ўжо сеяў дробны лапік, кату пад пяту, па-ранейшаму акуратна рабіў грады і стаўляў штогод парнічкі, без якіх бы, мусіць, змогся — і ногі выпруціў, і зубы паклаў на паліцу. Астатнія ж соткі запурыў клевярком — мо каму спатрэбіцца, мо хто возьме. Грады ён акуратна ўрабляў, кланяючыся кожнай травіначчы, кожнай сцябліначчы. З любоўю кланяўся, з павагаю. Зямля адчувала свайго гаспадара, хаця і здрабнелага, змяможанага, і па-ранейшаму радавала яго тымі маленькімі радасцямі, якія магла яму даць. Адным палохаў яго свой агарод — канюшынаю. Клевярок, штодра паліты дажджамі, буяў сёлета, як ніколі. Рана пусціўся расці, добра перазімаваўшы, рана пачаў красаваць. Краскі горда паднялі галовы, зірнулі на свет Божы, парадаваліся сонейку, акрыялі, набраліся моцы і мядова запахлі. Хмель мядовы завабіў на Гелеў агарод працавітых пчолак, тыя радасна-рупліва закружылі над кветкамі, зараз жа ўзяліся за працу. Людзі любаваліся Гелевым клевярком. Зноў жа, хто любаваўся, а хто і пацвельваўся: навошта ён бескароўнаму старому?

Рос клевярок, як на дражджах, адкрасаваў — край касіць трэба, бо паляжа не сёння-заўтра, пакруціць яго бурамі, якія ўсё часцей сталі залётваць ды гуляць па агародах улетку. Сам чорт тады рады не дасць. Забегаў Геля, затурбоціўся, каму збыць пожню? Не прадаць, не! Абы скасілі, высушылі, забралі, хай сабе і задарма, толькі вызвалілі месца для новай маладой травіцы...

Прадавалі пожні раней, калі вёска яшчэ дыхала, калі ў хлявах проці зімы раўлі галодныя каровы, як збавення чакаючы вясновае зялёнае пашы. Цяпер ці забярэ хто пожню дарма?.. Яшчэ каб высушыў, у капешачку склаў ды добра папрасіў, бліснуўшы ў кішэні бутэлькаю. А скасіць як? Таксама бутэльку стаўляй нейкаму чорту з балота... Смех дый годзе, каб за сваё ды гэдак выжыльвацца, ды гэдак маркоціцца. Рынак... нехадавы тавар. Кідаўся Геля, кідаўся, аднаму сказаў, у другога запытаўся, трэцяга прасіў — ніхто яго травы не ўзяў. Што рабіць? Спляжыцца, збузуецца агарод. І аднаго ранку не вытрымаў дзед, дастаў з-пад страхі касу ды рушыў у пракос. Адвыкла каса ад працы, затупілася, заржавела, вісеўшы латругаю пад крокваміі. Лайдацтва нікога не скрашвае. Ледзьве даў рады гаспадар касе сваёй, і біў яе, і мянташыў.

Касілася цяжка, хоць клевярок яшчэ й не паспеў сабе пакруціцца, ды, мусіць, заржавелі і ў гаспадара ўжо рукі без касы. Кожны ўзмах даваўся яму задушлівым потам, кожны пракос выходзіў з неймавернымі намаганнямі. Геля і хакаў, і курхукаў, і штораз адпачываў, знямогла абапёршыся на касавільна. Думаў, ужо й канцы аддасць тут, у пракосах. Але ні разу не прыйшло яму ў голаў дакараць сябе за тое, што робіць нібыта марную, сізіфаву працу. Так трэба, бо іншага не дадзена. Бо калі ён дапусціцца да быльнягу, то ўчыніць вялікі гвалт над сабою і страшны грэх перад Богам. Хай сабе лайдачуць іншыя, хай пралічваюць, што ім выгадней ды як лацвей, хай збягаюць у горад, за мяжу з'язджаюць. То іхняе — і ў іх там, пэўна ўсё атрымаецца, ашчасліveюць. А гэта во — яго: яго клевярок, яго зямелька, гэта яго крыж, які ён мусіць па жыцці несці. Плюнуць на крыж, растаптаць?!..

І — адолеў, скасіў... Дзівіліся людзі, як, узяўшы аграбелькі, рупна разбіваў ён пракосы. Праца гэта, даўно забытая, патыхала дзяцінствам, маладосцю і прыносіла старому сапраўднае задавальненне. Уяўляў, як гушкаецца ён, малы, паўзверх возу пахучага свежага сена, на які ўссадзіў яго бацька, каралём адчувае сябе падшыванец-хлапчук, гаспадаром сапраўднага зямнога багацця. Спамінаў-адчуваў таксама Геля, як бы сёння было, слодыч першага, нясмелага, цнатлівага пацалунка ў густой пахучай цемры, на сенавале, дзе з'ехала дранічана і праз шчыліну ў даху цікаўна зазірала адзінокая зорка ды зрэдзьчас падміргвала-падбадзёрвала юных закаханых рамантыкаў. Уяўляў, адчуваў, і лёгка працавалася старому на сакаўных зялёных пракосах. А потым сенца трэба было дасушыцца. І Божанька акурат на дзень ці на тры схаваў дажджы, а з-за хмараў выпусціў праветрыцца-пагуляць сонейка — ён таксама радаваўся за чалавека, які хаця і марную справу робіць, ды робіць яе па ягонаму, па-Боску. Сенца высахла ўмомант, разы са два падвярнуў яго Геля, як настаў час складваць у капешачку. О, гэта ён умее і любіць! Бывала, і стажкі стагаваў, а ўжо капешачку зробіць ён, як лялечку — не дачэпішся, не дакапаешся. Хоць ты яе на выстаўку вязі. Зразумела, пагана складзеную капешачку любы, нават лёгкі, вецярок набок паваліць, і дробны дожджык намочыць. А ўдалая капешка — як хата ўдалая, доўга прастаіць і людзям паслужыць. Напластаваць яе толькі як трэба, абгрэбці, не шкадуючы, ды спрытна завяршыць.

І скасіў, адзін, і высушыў, і напластаваў, і завяршыў Геля свой твор, вось толькі прадаць яго годна, ці хаця б аддаць, каб карысць ад яго паймелі добрыя людзі, так і не здолеў стары руплівец. Несучасным, някідкім таварам аказалася яго капешачка, у якую ўклаў творца гэтулькі душы. Кінуўся, зноў жа, па суседзях ён, па знаёмых. Ды хто накасіў ужо, хто паленаваўся ехаць па маленькую капешачку ды валэндацца з ёю. Адны адразу адмовілі, іншыя, пабяцаўшы, не забралі. Так і зачакалася капешачка свайго прынца, які павінен быў з'явіцца на белым кані ды з кап'ём у выглядзе вілаў. Перастаяла-пераспела, як дзеўкавекавуха. Сёння бяры — самы сок, а заўтра-паслязаўтра, калі абмыюць цябе халодныя дажджы ды абсіверaюць ветравеі — каму ты патрэбен будзеш? Чаму так несправядліва ўладкаваны гэты свет: чаму ўсё прыгожае, сапраўднае, зямное аказаўшыся непатрэбным, лішнім, незапатрабаваным, мусіць гібець і гніць, скарыўшыся бязлітаснаму лёсу, а ўсё таннае, ненатуральнае, бліскучае ды пустое як порхаўка, і ў цане цяпер, і ў модзе, і баль правіць?! Дзе ж ёсць Бог!

Не ведаў адказаў на тыя пытанні і гаспадар, які нудзіўся з кожным днём усё болей, гледзячы на той непрыкрыты гвалт, які ўчынілі над яго капешачкай суровыя вятры і дужыя дажджы. Нудзіўся і гніў Геля разам са сваёю капешачкай, пакуль тая бездапаможна прыгіналася да зямлі, урастаючы ў новае зялёнае пакаленне канюшыны. І аднойчы не вытрымаў. Гэдак і балота на агародзе развесці нядоўга. Пад капешкаю — трава не расце. А лета сыходзіць. Будзе пасярод яго клевярка наступным разам чорная пляма, як бяльмо на воку. Трэба, мусіць, спаліць, пакуль апагодзілася, бо далей болей, ужо й запалкі не падаткнеш — не загарыцца, хіба што пакідаць на кампосты. Ды як спаліць-спапяліць дзіця сваё дарагое, хай яно сабе і слова не скажа, бо немаўля, ды глядзіць на цябе з нямым адчаем... Немаўля, а пагляд дарослы, дакорлівы. Што ж ты, супастат, сваю працу губіш, свайму твору, якому гэтулькі спрыяў ды столькі з ім няньчыўся, сам жа галаву сячэш? А што рабіць, калі не куецца не плешчацца, а толькі век «вузка, цесна, мала». «Скуль узяць?»

І Геля, да чорта ў хаўрус запісаўшыся, рашуча схапіў запалкі. Было ў бутэлечцы крышачку газы, раптам не пакоціць збуцьвелае сена. Неслухмяныя, бы не свае, ногі цягнуліся да капешачкі, быццам ён злодзей які, быццам і не на сваім агародзе, а на чужым тую прыкрую справу задумаў. Усё яшчэ ногі на нешта спадзяваліся: раптам адбудзецца цуд і зменіць, зыначыць усё. Але цуд не адбыўся...

А капешачка, хоць не ведала пра блізкі свой канец, ды пра нешта такое здагадвалася, прадчувала. Прадчувала — але не баялася... Ат, чым так жыць... Згарыш — не згнієш. Не калацілася, не дрыжэла яна перад новым, нязведаным дасюль выпрабаваннем. Мо не засталося ўжо ў ёй анічога жывога ўсярэдзіне, і не было там чаму калаціцца і дрыжэць? І, калі яшчэ заставаліся парэшткі душы, дык тымі парэшткамі яна... ухваліла намер гаспадара, ухваліла, бо гэта быў, як ёй здавалася, адзіна правільны і магчымы, а галоўнае, годны і рашучы ўчынак.

Геля не мог пачуць перажыванні капешачкі, бо свае дасюль нязведаныя пачуцці перапоўнілі і аглушылі яго. Ці хопіць толькі рашучасці, ці раптам адумаецца? З жаркосці ды ў роспачы стары плёснуў газы, чыркануў запалкам ды — ходу. Толькі не глядзець, не бачыць, дабегчы да хаты і схавацца, перачакаць. А там — што будзе... Надзіва шпарка хлюпаў ён старымі галёшамі, заблудзіўшыся ў вузкіх баразначках між градамі, надзіва мужна трымаў раўнавагу, каб не ўпасці, не спатыкнуцца аб воглае каменне, што як на грэх кацілася пад ногі. Тым часам кволыя язычкі полымя за спіною, дужэючы, радасна нішчылі капешачку. Маленькія агеньчыкі неўзабаве зліліся ў адзін і паўсталі грозным вогненным слупам. Агонь, адчуўшы волю, расквітнеў, расправіў плечы, зрабіўся вялікім і страшным у сваёй прыгажосці. Сапраўдны пажар, на здзіў суседзям, разгараўся на агародзе ў дзеда Геляра.

Цяпер — дабегчы дадому... Каб толькі не здрадзілі ногі, якія з кожным крокам станавіліся ўсё болей цяжкімі ды неслухмянымі, бы хто гіры да іх прывязаў. Каб толькі не выскачыла сэрца, што з адчаем зняволенай птушкі, як у клетцы, білася ў грудзях. Яшчэ адзін крок, яшчэ... Пакутліва доўгаю здавалася яму дарога да свае хаты...

**Друкуецца ў скароце**

АПОВЕД

# ЗДРАДНАЯ СВІННЯ

Павел ЛЯХНОВІЧ



**Стаіць у Нарвегіі, непадалёк ад мяжы з Расіяй, высокая сопка. Ці то насупраць Печангі, ці то Ліінахамары, а можа Нікеля. Гэта цяпер не вельмі важна. Важна тое, што на сопцы гэтай вельмі магутны тэлескоп усталяваны, і калі няма дажджу або снегападу, праз гэты тэлескоп уся Кольская затока разам з Мотаўскай — як на далоні. А гэта ж амаль што ўвесь Паўночны флот. Бартавыя нумары караблёў, ды што там бартавыя — баявыя нумары на матроскіх галандках супастаты натаўскія чытаюць. Прынамсі так асабісты, то рэч «унукі» жалезнага Фэліка, земляка нашага, кажуць.**

Прынеслі неяк начальніку супастацкаму здымкі. На іх стратэгічны падводны крэйсер з Сайда-губы ў мора выходзіць. Дакладваюць, так і так: на баявую службу выходзіць падводны крэйсер тыпу «Кальмар», праект 667 БДР, шаснаццаць балістычных ракет, камандзір Іваноў… Ну, усе звесткі далажылі начальніку, што з розных выведных крыніц атрымалі. Толькі, кажуць, ёсць тут адна незвычайнасць. Што б гэта магло значыць, не можам расшыфраваць. Збіралі ўсіх адмыслоўцаў, мазгавы штурм рабілі — не, ніякай прыстойнай версіі не выходзіць. Тут, сэр начальнік (бос па-іхняму), вось на чорнай спіне ракетна-ядзернага монстра расійскага, нешта белае. Гэта, у чорных бушлатах і аранжавых выратавальных камізэльках — швартоўныя каманды. Гэтыя, на мосціку, у скураных куртках з башлыкамі, група кіравання: камандзір, штурман, вахценны афіцэр. З гэтымі ўсё зразумела. Нават прозвішчы ведаем. А вось на ракетнай палубе… вельмі свінню нагадвае. Можа, якія новыя сакрэтныя сродкі выратавальныя? Гідракасцюм невядомы? Тады чаму не вертыкальна, а гарызантальна? Можа, у стане алкагольнага ап'янення? Яны часам злоўжываюць — традыцыя такая нацыянальная — і часам не паспяваюць да выхаду ў мора працверазець… Ці сапраўды свіння? Падобна — так. Але навошта на стратэгічным ракетна-ядзерным караблі — свіння?

Прыгледзеўся бос да здымка, нават лупу ўзяў. Сапраўды — свіння.

— Думаю, — кажа, — гэта нейкая новая зброя расійская. На Чарнаморскім флоце па маіх дадзеных яны баявых дэльфінаў рыхтуюць — смертнікаў, варожыя караблі падрываць. А тут, відаць — баявых свіней... Хоць… Ах, гэта таямнічая руская душа!... А выклічце мне майго асабістага сакрэтнага эксперта!

І выклікалі. Ці то эмігрант з «першай хвалі», ці то збеглы кэгэбульнік. Вельмі сакрэтны.

Паглядзеў эксперт, адразу важны стаў:

— Паслугі мае, — цэдзіць праз губу, — эксклюзіўныя. Ніхто апроч мяне растлумачыць гэты факт не здолее. Таму гэта каштаваць вам будзе… — і лічбу называе такую, што падводніку расійскаму каб столькі хоць бы ў рублях савецкіх атрымаць, трэба гадоў семдзесят з «жалеза» не злазіць. — А экспертнае заключэнне, што я вам дам маю, вельмі сур'ёзнае для забеспячэння бяспекі…

— Ноў проблем, — кажа бос. — Дзеля бяспекі гэта дык зусім грошы невялікія… Ну, і што гэта за аб'ект на стратэгічным аб'екце (пшэпрашам за таўталогію, сэр эксперт)?

— Гэта свіння, сэр бос.

— І я думаю, што свіння, сэр эксперт. Але якую небяспеку нясе гэтая свіння нашай нацыянальнай бяспецы? Мабыць — гэта баявая свіння-смертніца, накшталт баявых дэльфінаў?

— Так, сэр бос, гэта свіння-смертніца. А факт яе знаходжання на борце стратэгічнай падводнай адзінкі сведчыць аб знаходжанні на гэтым борце высокага начальніка, што ў сваю чаргу сведчыць аб незвычайнай баявой службе гэтай адзінкі, можа, нават аб баявой службе, сумешчанай з перадыслакацыяй гэтай адзінкі на іншы акіянскі тэатр… Так што чакайце ў хуткім часе гэты крэйсер на Ціхім акіяне…

Як у ваду глядзеў!

Камандуючы флатыліяй падводных лодак меў на кожным пагоне па дзве зоркі-«павукі» і вельмі хацеў яшчэ адну — на грудзі. Камандуючы, віцэ-адмірал, не быў яшчэ Героем Савецкага Саюза. А тут выпадала неблагая магчымасць: сябры з Галоўнага штаба ВМФ шапнулі, што калі ўсё пройдзе «ціп-топ», старшы на пераходзе атрымае зорку. Тую самую, залатую. Дык не аддаваць жа яе камандзіру лодкі! Хоць і рызыкоўна, але такога выпадку больш можа не здарыцца. Гады, ведаеце…

…Кожнаму, хто цікавіцца, вядома: самыя стратэгічныя ў свеце падводныя лодкі будуюць карабелы з Северадзвінску, што на Белым моры. І што з розных прычынаў гэтыя атамныя веліканы з ядзернай зброяй служаць толькі на Паўночным флоце і на Ціхаакіянскім. Зазвычай караблі з Белага мора пераганялі на Камчатку амаль кругасветным шляхам — вакол Эўропы-Афрыкі-Азіі. Памазгавалі ў Маскве людзі з дзяржаўнымі глуздамі і вырашылі паспрабаваць пераганяць іх кароткім шляхам: паўночным марскім, уздоўж эсэсэсэраўскага пабярэжжа. Здагадаліся — так больш выгадна. І выдзелілі на гэтую справу першаму камандзіру, які лодку з Поўначы на Ціхі акіян перагоніць, залатую зорку. Ну, і яшчэ там ордэнаў колькі, медалёў — тым, на каго ў выпадку паспяховага пераходу зампаліт, прадстаўнік кіруючай партыі ў флоцкім целе, пакажа.

Дык што гэта будзе? Камандзір — Герой, а Камандуючы — не? Таму і прапанаваў сябе адмірал з двума «павукамі» на пагонах у старшыя на пераходзе.

У Карабельным Статуце Ваенна-марскога флота СССР абавязкі распісаны ад камандзіра злучэння і ніжэй, флатылія ж падводных лодак з'яўляецца аб'яднаннем. Якія абавязкі ў Камандуючага аб'яднаннем? А-а… Вось! Няма іх у Статуце. Апрача таго, артыкул 132 кажа так: «Присутнасць на борце карабля старшых начальнікаў не здымае з камандзіра карабля адказнасці за карабель і выкананне сваіх абавязкаў». Так што калі пераход пройдзе ўдала — Камандуючы малойца і Герой, калі не — камандзір падлодкі чмо і прaснак каровін.

Стратэгія, яцішкін бабай!..

…Пяць гадзінаў да выхаду. «Увага! На карабель прыбыў Камандуючы флатыліяй і афіцэры штаба!» Праз дзесяць хвілінаў: «Камандзірам падраздзяленняў сабрацца ў кают-кампаніі на даклад!» «Бычкі» — так для сцісласці завуць падводнікі камандзіраў баявых частак — ціха мацюкаючыся, пасунуліся ў пяты «біс». Кают-кампанія забіта штабнымі. Пазаймалі ўсе крэслы. Стоўпіліся «бычкі» — хто дзе — у праходах між сталамі.

— Таварышы афіцэры!! — Гэта каманда такая. Матросам гарлаюць «Смірна!», а афіцэрам — вось так.

Усталі, хто сядзеў. Камандуючы зайшоў. Сеў у камандзірскае крэсла. Морда чырвоная, як бурак. У яго заўсёды чырвоная. Камандзір збоку прытуліўся.

— Таварышы афіцэры. — Таксама каманда. Толькі больш лагодная. Матросам кажуць «Вольна!».

Селі.

— Камандзір БЧ-1, ваш даклад.

— Камандзір БЧ-1, капітан трэцяга рангу Смыкаў. У штурманскай баявой часткі асабовы склад на борце цалкам, навігацыйны комплекс запушчаны, курсаўказальнікі ў мерыдыяне, ЗІП укамплектаваны… Баявая частка да паходу гатовая.

— Камандзір БЧ-2…

— Командыр БЧ-2, капытан… — з моцным украінскім акцэнтам, — другого рангу Марцын. У ракэтної боэвої часты особовы склад… готові.

— Камандзір БЧ-3…

— …

— Памочнік камандзіра!

— Памочнік камандзіра капітан трэцяга рангу Рулькевіч. Асабовы склад службы забеспячэння на борце цалкам…

— Кок добры?

— На «гражданцы» быў шэфповарам у рэстаране, таварыш Камандуючы (па статуце звяртацца трэба па званні: «таварыш віцэадмірал», але ўсе ведаюць, што ён вельмі любіць так — «таварыш Камандуючы»). Амаль «таварыш Галоўнакамандуючы». Нават амаль «Вярхоўны Галоўнакамандуючы»!…)

— Добра… Далей…

— Харчовыя запасы загружаны…

— Свініну загрузіў?

— Свініны бербаза не дала, толькі ялавічына і кенгурацiна, таварыш Камандуючы.

— Ды ты што!? Як жа ж без свініны? Я ж без свініны… — Павярнуўся да камандзіра бербазы, «чырвонапёрага» палкоўніка (форма чорная, пагоны з чырвонымі «прасветамі»), — Ты што, Іван Нікіфаравіч, я ж табе за гэта анус парву, я ж без свініны… І не рабіце тут твар дамінантнага бабуіна, палкоўнік!

— Ёсць, таварыш Камандуючы! — (Аніякіх лішніх словаў, бо сапраўды парве.) І шэптам да памочніка: — Дай паперку! Паперку дай! Запіску напішу — возьмеш на падсобнай гаспадарцы!

Чатыры гадзіны да выхаду. «Так, туша заважыць хай сто кілаграмаў. — «Маракуваў» Рулькевіч. — Не, можа нават сто пяцьдзесят. Будзем сыходзіць з горшага. Да падсобнай гаспадаркі два з нечым кіламетры. Колькі трэба матросаў, каб перанесці свіную тушу ў стосто пяцьдзесят кілаграмаў за два кіламетры? Задачка, туды-т яе ў цёціну пячорку! Хай па трыццаць кіль на рыла… Не, хілякі гэтыя па трыццаць доўга несці будуць. Па дваццаць… Краіне патрэбныя героі, а прысылаюць дыстрофікаў… Гэта значыць: сто пяцьдзесят кіль на дваццаць — трэба сем з паловай матросаў… Цьфу ты! Восем матросаў. А як несці? Вяроўкамі абвяжам! ». — Боцмана ў цэнтральны!

— Боцман, тэрмінова метраў дваццаць-трыццаць якога ліня. Нятоўстага. Як няма? Што значыць — няма? Ты боцман, ці дзе? Ну, блін, выйдзем у мора, я табе адмасірую прастату! Давай пакуль два кідальных канцы. Не, тры! А-а! Чатыры давай!

Шмат анекдотаў складзена флоцкімі стваральнікамі фальклёру пра берагавую базу ўвогуле і пра падсобную гаспадарку ў прыватнасці. Падсобная гаспадарка — гэта папросту свінарнік, няштатнае ўтварэнне палітадзельскай думкі і бербазаўскай дзеі. Каб аб'едкі з берагавога камбуза дарэмна не прападалі. Працаваць туды пасылаюць зазвычай сыноў Цэнтральнай Азіі, паслядоўнікаў вучэння Прарока Магамеда, якія кепска ведаюць расійскую мову. Хоць якая ад іх карысць. І заадно — барацьба з рэлігійным дурманам.

…Матрос у свінарніку пакруціў у руках запіску, выпісаную камандзірам бербазы, і падвёў Рулькевіча да загародкі, дзе рохкаў вялізны — што гара — парсюк. — «Забірай, начальнік».

— Ты што! — Ажно захлынуўся Рулькевіч. — Што я з ім рабіць буду! Ты мне тушу давай!

— Бяры туша, начальнік!

— Ангідрыт-тваю міндалевкую маму… Мяса! Мяса давай! Свініну!

— Бяры свініна, начальнік. Зробіш чык-чык, мяса будзе.

— Ты! Ты сам зрабі «чык-чык»!

— Не, начальнік! Суюнбай карміць — так, чык-чык — не!..

…Гадзіна да выхаду. Прыбралі канцы электрахарчавання з берага. Прыбралі дадатковыя швартовыя. Шматтысячатонны падводны волат ля пірса на двух нітках — насавым і кармавым швартовых. Камандзір на мосціку, нервуецца:

— Ну дзе гэты ёлуп! Паслаў, даруй Госпадзе, Ты мне памочнічка! І матросаў звёў! Колькі з ім пайшло? Старпом! Колькі чалавек з памочнікам пайшло? А ну з павінен ведаць? Тэ-экс. А што гэта там? Сігнальшчык! Бінокль! О! Ідуць! А гэта што? Ну, вагіна кабылячая! Ён жывую свінню сюды валачэ!

Прывязаўшы да ног кідальныя канцы, матросы перастаўлялі парсюку ногі. Парсюк упіраўся. Да мосціка даносіўся ягоны асіплы віск. А вагі ў ім было, відаць, за дзвесце кэгэ.

— Мост — цэнтральнаму, — ажыў на мосціку «Каштан».

— Ёсць мосцік!

— Аператыўны перадаў: Камандуючы да нас выехаў. — На пірс упацелыя матросы зацягвалі парсюка. Той растапырваў ногі і адхіляўся ўсім тулавам назад. Рулькевіч піхаў яго ў круглыя кумпякі.

— Да кармы цягніце, ёхарны клітар! — Зароў у «мацюгальнік» старпом. — Камандуючы на пад'ездзе! На ракетную палубу! Перакіньце пару латкоў ад электрахарчавання! Па латках!

…«Волга» Камандуючага ўз'ехала на пірс. На ракетнай палубе шчыльным шыхтом стаяла кармавая швартоўная каманда. За спінамі швартоўшчыкаў, прысеўшы, Рулькевіч чухаў парсюка за вухам: «Дзюдзя. Дзюдзя. Ну дзюдзя, толькі не вісоўвайся! Хай флатаводзец у «бітон» залезе». Абвіты канцамі, парсюк спробаў выскачыць з-за спінаў на адміральскія вочы не рабіў. Стаяў сабе, раскірачаны.

— Смірна! Таварыш Камандуючы…

— Вольна! Аддаць кармавы! — Швартоўшчыкі рассыпаліся, пабеглі ў карму.

— Аддаць насавы! Тры гудкі тыфонам! Правая — назад малы! Руль — лева дзесяць!

Паехалі. На чорным целе, як яечка на патэльні, свяцілася цела белае. Здраднае. От, які ён цяжкі — рэжым сакрэтнасці!

ВІДАРЫСЫ

# EFTER PARADISET*

Франц СІЎКО

**…Я гляджу на дзівосы замежнага жыцця і аналізую іх выключна з практычнага боку: зашмуляныя туфлі немаладой парыжанкі ў метро займаюць маё ўяўленне куды больш за багемную выключнасць Манмартра, а заношаная манжэта на рукаве кіроўцы ў аўтобусе на шляху з ускраіны Рыма да Ватыкана дае фантазіі куды больш спажывы, чым велічны выгляд усіх Калізеяў, разам узятых. Так было падчас паездкі ў Італію гадоў пятнаццаць таму, так было падчас выправы ў Парыж у 97-м, так было і ў час нядаўняй неспадзеўнай — з ласкі роднага творчага саюза — вандроўкі на шведскі Готланд.**



Мая выправа на Готланд пачалася задоўга да дня ад'езду. Месяцы за чатыры да яго, з тае хвіліны, як міжволі давялося засесці за падручнікі шведскай мовы. Вучыцца якую я пачынаў ад нуля, але пачынаў, праўда, з такім запалам, што неадноўчы падчас курсу ўначы прачынаўся, ловячы сябе на тым, што ў дрэме паўтараю ў памяці шведскія словы...

Я стаяў у Вісбю на набярэжнай, як раптам пачуў зусім побач такое гучнае «Sjö! Sjö!», што аж знянацку скалануўся. Некалькі падлеткаў, заінтрыгаваныя, мусіць, утрапёнасцю майго скіраванага на порсткія балтыйскія хвалі пагляду, захацелі мне нагадаць, што гэта — *шё* (мора, возера). Вось бы, пэўна, здзівіліся яны, калі б пачулі ў адказ, што ў нас на мяжы трох раёнаў Віцебшчыны, у мясціне, якая продкаў іх, вікінгаў, памятае, сваё Шо маецца. Акваторыя якога, дарэчы, да нядаўняга часу лічылася геаграфічным цэнтрам Еўропы. І што ў ваколіцах вёскі, дзе я вучыўся ў школе, значны адсотак тутэйшых жыхароў носіць прозвішча Швед.

Але найбольш цікавым падалося мне ў шведскай мове слова *by* (вёска). З-за поўнага падабенства да канцавога складніка нашых айчынных электронных (tut.by-еўскіх) адрасоў — трапней, каб і хацеў, наўрад прыдумаеш. Так і ўяўляецца мне яго шведскі сэнс, ледзь пачну адчыняць сваю паштовую скрыню…

Я прачнуўся ўранку ад нейкага галасу за рогам дома. Вызірнуў з вакна і не даў сабе веры: усю вулку збоч дома акупавала працэсія з маладых бацькоў, якія везлі на драўляных самаробных павозках сваіх дзяцей у цэнтр горада. Усе як адзін, у тым ліку і дзеткі, былі апранутыя ў сярэднявечныя строі, некаторыя — пры цацачнай зброі. Я ведаў, што з гэтага дня ў Вісбю, сталіцы Готланда, мае пачынацца свята Сярэднявечча. Але што ажно гэткім будзе яно маляўнічым і шматлюдным, не ўяўляў. «А хто там ідзе?» — міжволі ўсплыло ў памяці. «Маладыя шведскія бацькі вязуць малых шведзікаў паглядзець «на свет белы», — сам сабою склаўся адказ. І так на працягу тыдня: дзеці, моладзь, старыя — усе на свяце, кожнаму яно дарагое, кожнаму абыходзіць. Такая, мабыць, іхняя ідэалогія: простая, даходлівая, уцямная. Якую не спяцы-ідэолагі будуюць метадам запалохвання.

Што кінулася ў вочы ў Вісбю падчас тае святочнае сярэднявечнае містэрыі, дык гэта поўная адсутнасць так характэрных для нашых айчынных дзеяў падобнага кшталту рэверансаў на адрас суседзяў. Мясцовая готландская прыгажуня здрадзіла роднаму гораду з-за сімпатыі да дацкага ваяра? У мора яе! Утапіць пад галёканне абураных нечуванаю здрадаю суайчыннікаў! Як непадобна ўсё тое на спалітызаванае, заідэалагізаванае адкрыццё ці сканчэнне нашага «Славянскага базару», калі што ні фраза, то — «братні народ», «вечнае сяброўства», «агульныя карані», агулам жа — любоў да знямогі…

Шведская запалка, шведскі стол, шведская сценка, шведская сям'я — з усіх гэтых шыракавядомых клішэ, што сімвалізуюць іхні лад жыцця ды ступень шведскага ўплыву ў свеце, канечне, апошні — самы пікантны і разам з тым беспадстаўны. Тое рашуча даводзяць складальнікі пачатковага курса шведскай мовы, разбіваючы ўшчэнт нашае аблуднае ўяўленне аб шведскай сям'і як аб сужэнстве трох асобаў. І наогул шведы, як мне падалося, людзі цнатлівыя. І вытрыманыя: тут не спаткаеш звыклых для іншых шыротаў беспардонных заляцанак абарыгенаў да прыезджых жанчын ці сцэнаў прылюднага высвятлення сямейных адносінаў. І разам з тым і голае дарэшты цела на пляжы ў атачэнні людзей у пурытанскага выгляду шортах — таксама не рэдкасць. Дэманструючы прыхільнасць да фундаментальных сямейных каштоўнасцяў, шведскае грамадства, падалося, ставіцца цярпіма да нетрадыцыйных поглядаў на каханне. Такое ўражанне, прынамсі, складваецца, калі гартаеш мясцовыя газеты з аб'явамі. Але гэта, мабыць, на меркаванне стаpoнняга чалавека: у чужую скуру не ўлезеш.

Што асабліва імпанавала і імпануе мне ў шведах, дык гэта іх абавязковасць і схільнасць усё загадзя планаваць. Рысы, безумоўна, выхаваныя стагоддзямі працы над сабой, якіх нам гэтак часта катастрафічна не хапае. Зрабіць якія сваім alter ego, часткай ладу жыцця, а тым больш менталітэту, між іншым, не вельмі і імкнёмся. «Планаваць справы на паўгода наперад? Глупства!» — дружна абурыліся два маладзёны, калі распавёў ім пра практыку планавання справаў іх шведскімі аднагодкамі на трэці, ці семнаццаты, ці дваццаць сёмы ад пачатку новага года тыдзень. «Што ты робіш на трыццаць другім тыдні?» — «Іду ў вандроўку з сябрамі». — «О, тады пазней сустрэнемся. На трыццаць чацвёртым, можа?».

Сімвал Готланда — авечка, сімвал Вісбю — вожык. Апошнія шпацыруюць па горадзе, як у Віцебску каты, адно што не ў гэткай колькасці, канечне. У родным маім Міжрэччы таксама вожыкаў было шмат. Але ўпершыню пабачыць, як харчуецца гэтае жамяраеднае, давялося менавіта ў Вісбю, на пляцы перад галоўнаю готландскай шыркаю (кірхай). Жывеліна з'ўляецца з прыцемкам на лапіку пожні і пачынае ўтрапёна абшукваць яго на прадмет спажывы. Даследуе па дыяганалі траву, як свіння лычам зямлю, — метадычна, дзелавіта, па-гаспадарску, без боязі натыкнуцца на знячэўку злосць істоты двухногае. Кінеш яму са сходаў на стыканую іголкамі спіну лёгкі кавалак друзу — нават не схамянецца. І на вуліцы яго спаткаеш на змярканні, калі шпацыруе няведама куды, пераходзячы па бруку ад двара да двара...

Калі вожык — сімвал Вісбю, то фірмовы знак горада, безумоўна, — ровар. Але не ў сэнсе характарыстыкі ўзроўню дабрабыту ці чагосьці яшчэ са сферы матэрыяльнага, а ў сэнсе вартасці ўзроўню ўзаемаадносінаў між людзьмі. У прыватнасці, адносінаў паміж кіроўцамі і пешаходамі. Роварам у Вісбю, як і наогул у Швецыі, нікога не здзівіш, іх тут так шмат, што стракацізь увачу. А вось язда на роварах, асабліва пры перасячэнні шматлікіх пятлястых пераходаў, надоўга застаецца ў памяці. Дома я не садзіўся на ровар каля 40 гадоў. А ў Вісбю гэта адбылося так проста і натуральна, быццам усё жыццё толькі гэткаю справаю і займаўся. Проста сеў і паехаў. І як не паехаць, калі ты на вуліцы — пан. Табе яшчэ пяць метраў да «зебры», а вадзіцелі аўто з абодвух бакоў ужо спыняюцца, каб саступіць дарогу. Цудоўнае адчуванне, але і небяспечнае, бо да добрага хутка прывыкаеш. Апошняе на сабе зведаў, ледзь не трапіўшы па вяртанні ў Віцебск, залюляны памяццю аб простасці язды па вулках Вісбю, пад машыну на адным з нашых пераходаў.

Пры знаёмстве з чужым горадам важна пабачыць яго ваколіцы. Прыгарадны ландшафт, рэльеф мясцовасці, нават моц ветру, што ў кожным закутку розная, — усё гэта спрыяе больш поўнаму ўяўленню аб самім горадзе, дае адчуванне яго прасторавай перспектывы. Так я зразумеў у свой час, ужо ладна пажыўшы ў горадзе над Дзвіною, свой Віцебск. Так раблю кожны раз, трапляючы ў незнаёмую дагэтуль мясціну. Тым болей калі мясціна такая пярэстая, як Готланд, дзе што ні дзесятак вёрстаў, то новы відарыс, новае ўражанне, адметная візуальная карціна.

Чым здзіўляе сельскі Готланд, дык гэта нераўнавагаю паміж «непрычасанасцю» прыроды і цывілізаванасцю сядзібаў. Дзікая, нейкая нават часам, здаецца, агрэсіўная ў сваёй першароднай дзікасці натура — і дагледжаныя, бліснь ды ясь, будынкі. Жытло і адцяняе неўтаймоўнасць прыроды і разам з тым быццам суцішвае яе, падвысакароджвае, ці што. Так што нават пабудовы кшталту абораў для падкормлівання авечак, што раз-пораз узнікаюць сям і там усцяж складзеных з горнай пароды загародак, не здаюцца на Готландзе рудыментамі прамінулага часу. Наш ватыканападобны Мосар у параўнанні з выспавымі готландскімі краявідамі — наадварот, аазіс хараства на тле ўбоства. Памятаю першае сваё, неспадзеўнае, па дарозе аднекуль, знаёмства з Мосарам. Быццам у казку ўехаў. А выехалі з таго парадызу: хаты пахілыя, шэрыя наўкола — і быццам і не было ніякага цуду…

Хоць канец ліпеня і пачатак жніўня і цёплыя на Готландзе, і Гальфстрым дае аб сабе знаць падчас купання ў моры, і сонца на пяшчоту не сказаць каб скупое, усё адно адчуванне, што гэта краіна паўночная, не пакідае ні на хвіліну. То вецер падзьме раптам з Балтыкі, вокамгненна зменіць краявід ды спупырышыць скуру на руках-нагах, то крывенькія хвоі ды іншыя прадстаўнікі мясцовай флоры ўсцяж дарогі пацямнеюць пад завесаю наплылых няведама адкуль хмараў, то трава збоч сцяжыны пахінецца долу пад ціскам дажджавых кропляў. Едзеш на роварах ўздоўж узбярэжжа і чамусьці міжволі ўяўляеш, як яно ўсё выглядае тут узімку: сцішна, самотна, маўкліва.

Здаецца, і невялікі Готланд, усяго крыху больш за 3 тысячы квадратаў займае разам з прылеглаю выспай Форё, а прыбярэжная марская паласа так адрозніваецца ў процілеглых яго кутках, быццам у розных кліматычных шыротах размешчаная. У Вісбю бераг камяністы, адно пільнуйся, каб ногі не парэзаць, а на Форё — такая роўнядзь пясчаная пры вадзе, што, здаецца, без парашута можна на яе прызямляцца. І пляжы адпаведна розняцца, як неба і зямля. Затое раслiннасць пры берагах усюды падобная — калматая, дзікая, шматкамі. Ды яшчэ пах аднолькавы — вострай гаючай гнілі водарасцяў, што працінае кожную тваю клетку, а ўсё яго мала.

Дзве загадзя планаваныя рэчы не зрабіў я на Готландзе. Першае — не паспытаў расхваленай аўтарамі турыстычных праспектаў як ледзь не галоўнае шведскае мясное стравы пад назвам шётбуля (köttbulla). Другое — не пабачыў тамтэйшага верасу. Шётбулю да апошняга спадзяваўся з'есці ў Стакгольме на шляху дадому, ды на той дзень яе акурат у меню рэстарацыі, куды павялі падмацавацца супрацоўнік Шведскага саюза пісьменнікаў Хенрык Энбом, паэт Зміцер Плакс і калега-перакладчыца Ан, не аказалася. Што да верасу, то ён стаўся ахвяраю ўласнае мае забыўлівасці. Быў момант, калі можна было тое зрабіць па дарозе на Форё, папрасіўшы кіроўцу на колькі хвілін прыпыніцца ў ляску. Але выскачыла з галавы назва па-шведску, а слоўніка, каб патлумачыць, што дзядзьку з Беларусі абыходзіць у гэным лесе, як на тое, пры сабе не аказалася…

Праз тыдзень па вяртанні з Готланда — тэлефонны званок увечары пад тытры па-шведску на канале «History». Віля Швед, аднакласніца з малой радзімы:

— Ну, як з'ездзіў? Кавы, віна, мабыць, папіў смачных? Было? Хваліся.

Было — галоўным чынам падчас выправаў за межы горада ды ў сталоўцы дома творчасці пад сіпенне грамадскае кававаркі. Хапала, вядома, хоць, канечне, не з каптуром: думка пра тое, што вось вернешся дадому і павінен будзеш круціцца на менш як 200-даляравы выкладчыцкі заробак у месяц, не надта пусціць раскашаваць.

Яшчэ праз тыдзень па справе да біскупа Уладзіслава Бліна пайшоў, а ў яго на стале — дай веры! — вазон з галінкамі верасу. Нашага, мясцовага, вядома: хтосьці прэзентаваў. І вось стаіць букет у гасцёўні, радуе гаспадара сакаўною квеценню ды быццам адмыслова, каб страту готландскую кампенсаваць, майго прыходу чакае. Не прыгажэйшы, мабыць, за готландскі, ды, пэўна ж, і не горшы. Свой.

Сваё — тое, што належыць нам паводле закону спадчыннасці. Альбо набытае ва ўласнасць працаю, намаганнямі, і часам немалымі. Калі ж нешта чужое нас прываблівае, і займець яго ў якасці свайго надта хочацца, тады адзіны шлях да задавальнення такога неадольнага свербу — скарыстаць узор жаданага чужога дзеля стварэння гэткага ж свайго. Прыкладна так мне думалася ў цягніку з Вільні на Мінск падчас вяртання з Готланда. Ззаду засталіся перадні з Вісбю ў Стакгольм і са Стакгольма ў Вільню, яшчэ зусім свежыя былі ўражанні ад выспы і гасцінных, зычлівых гаспадароў Baltic Centre, а мне хацелася як хутчэй апынуцца ў Беларусі. Канечне, такую мясціну, як Готланд, не палюбіць немагчыма. Ды, надзіва, асаблівага смутку ад расстання з зямным раем не было — толькі стома ды жаданне адасобіцца ад не ў меру схільных да размоваў суседзяў па купэ. Апошнім штрыхам утомнага вяжу сталі тры піражкі ў будынку мінскага вакзала, якімі я не даў рады не спакусіцца з-за неймавернай іх (у параўнанні са шведскімі коштамі на прадукцыю падобнага кшталту) таннасці. Якія тут жа, нягледзячы, што былі тыя піражкі каляныя, бы глыжы, пахапкам і праглынуў: дома, вядома, і салома ядома.

* Пасля раю (шведск.).

**Друкуецца ў скароце. Цалкам эсэ будзе апублікавана ў часопісе «Дзеяслоў»**

## ДЗЕЯПІС

**Рыгор Барадулін. Перакуленае/Опрокинутое; укл. Сяргей Шапран. — Москва: «Время», 2010. — 512 стар.: іл. — Наклад 1500 ас. — (Поэтическая библиотека)**




Гэтая ўнікальная кніга — спроба выдавецтва, Саюза беларускіх пісьменнікаў, сяброў і калегаў народнага паэта Беларусі напярэдадні ягонага юбілею падвесці творчыя вынікі пражытага і перадуманага нацыянальным Арфеем. У шыкоўна выдадзеным зборніку арыгіналы вершаў Р.Барадуліна падаюцца паралельна з іх лепшымі перакладамі на расійскую мову — і пад адной вокладкай гучаць словы ямчэ і Якава Хелемскага, Ігара Шкляроўскага, Аляксандра Дракахруста, Навума Кісліка, Валянціна Тараса, Івана Бурсава, Фёдара Яфімава ды маладзейшых Марыны Наталіч і Вікторыі Салаўёвай. «Святам шамана» назваў тую дзею — і сваю прадмову да кнігі — Уладзімір Някляеў.

**Ніл Гілевіч. Замова ад страху: новая кніга паэзіі. — Мінск: «Медысонт», 2009. — 96 с. — (Бібліятэчка часопіса «Дзеяслоў»; вып. 12)**




Новую кнігу Народнага паэта Беларусі Ніла Гілевіча «Замова ад страху» склалі лірычныя і ліра-эпічныя творы рознага кшталту і розных, не толькі самых апошніх, гадоў. Усе яны друкаваліся, па меры напісання, у часопісах і газетах, але ў ранейшыя зборнікі аўтара не ўваходзілі. Кніга стала калядным падарункам ад выдаўцоў — Нілу Гілевічу, а ад патрыярха беларускай літаратуры — беларускім чытачам. Але падобныя падарункі не маюць «прывязкі» да пэўнага часу: «Замова ад страху» з тых кніг, што называюць вечнымі…

**Дар'я Ліс. Вясновы jazz: вершы, апавяданні. — Гародня: «Гарадзенская бібліятэка», 2009. — 60 стар. Наклад 200 ас.**

Прадстаўляючы сябе, Дар'я Ліс піша пра свае мары: «1. пабачыць Парыж (і жыць далей) ды папіць кавы ў кавярнях, дзе бываў Хемінгуэй, пахадзіць вулачкамі Вільні, пабачыць Балтыку; 2. праца, што дапамога ажыццявіць п.1 і быць фінансава незалежнай — у першую чаргу ад сваіх фізічных абмежаванняў...». Шчырая і непасрэдная Дар'я не толькі ў гэтых радках, але і ў сваіх творах. «Героі яе апавяданняў маральна прыгожыя, духоўна багатыя, выхаваныя і адукаваныя... — піша ў прадмове Данута Бічэль, — у творчасці Дар'я перажывае паўнату жыцця, сваіх дзявочых мараў, перадае




пасланне і прывітанне добрым людзям, каб даведаліся пра яе перажыванні...». Дададзім з прыемнасцю, што вершы і проза Дар'і Ліс добра вядомыя чытачам па адметных, заўважаных і адзначаных, публікацыях у «Дзеяслове». Аднак, сабраныя ў кнігу, яны, як гэта часта бывае, «загучалі» зусім па-новаму.

**Геннадий Лопатин. Увидеть дерево: книга поэзии. — Москва: ЧеРо, 2008. — 52 стар. Наклад не пазначаны**




Генадзь Лапацін жыве ў Ветцы, што на Гомельшчыне. Піша вершы па-беларуску і па-руску. Але найперш — па-руску. Піша так, як ніхто ў нашай немалой краіне. І застаецца «невядомым правінцыйным паэтам»... Гучыць крыўдна. Але не для Генадзя, а для нас, што прывыклі раскідвацца талентамі, і не заўважаць іх, пакуль яны побач з намі... Аднак — ёсць надзея, і нават упэўненасць, што ўзлёт Генадзя і ягонай вядомасць — яшчэ наперадзе. І будуць ягонымі вершамі зачытвацца не толькі ў Мінску ці Маскве... Вучыць на памяць і цытаваць...

**Дзмітры Плакс. Трыццаць тэкстаў. Мінск, «Медысонт», 2009. — 64 с. — Бібліятэчка часопіса «Дзеяслоў»**




Адзін з першых водгукаў на гэтую кнігу напісала Аляксандра Дынько. Свае ўражанні ад прачытання яна выказала так: «Унікальны прыклад тэкстаў, у якіх голас і інтанацыя ёсць вызначэннем і ўмоваю гранічна важных паняткаў: жыцця і смерці, любові і кахання, дзеяння і не-дзеяння. Выдатны камертон для чытачоў: няверна ўзятая нота, мінімальны фальш, няшчырасць, ці ў пачуццях, ці ў думках, — і вершы ўнікаюць цябе, распадаючыся на чорныя друкарскія значкі:

«Тлусты ліст ляціць віхор круціць пяць хвілін пачакаю яшчэ ўчора ня трэба нам мора ні сьлёз ні шчасьця абы ня ўпасьці толькі б утрымацца дакрануцца памацаць яшчэ раз адчуць і адбіцца адлаяцца не ўкляпацца ў зямлю цалкам»

### ВОСТРАСЛОЎЕ

# АЛЕСЬ НЯЎВЕСЬ

## Дыялог двух літаратараў

Старшыня Саюза беларускіх пісьменнікаў Алесь Пашкевіч расказаў радыё «Свабода» аб атрыманні ліста з «высокай установы», у якім старэйшая творчая арганізацыя Беларусі названая «дэструктыўнай арганізацыяй, членства ў якой несумяшчальнае з працай у дзяржаўных установах і ведамствах». «Ва ўльтыматыўнай форме дзесяткам членаў СБП было выказана наступнае патрабаванне: або вы пішаце заяву аб выхадзе з грамадскага аб'яднання, або вы працаваць не будзеце… СБП патрабуе тэрмінова спыніць пераслед пісьменнікаў, членаў грамадскага аб'яднання «СБП» і даць належную ацэнку дэструктыўнай дзейнасці кіраўніцтва новастворанага Саюза пісьменнікаў Беларусі (СПБ) на чале з Мікалаем Чаргінцом...»

*Аратыя*
*Літаратурнай нівы*
*Сустрэліся.*
*Купілі піва гляк.*
*Адзін пісаў «крутыя» дэтэктывы,*
*Другі паэзію надзейна зацугляў.*
*Сказаў паэт:*
*— Згнаіла мову ўлада,*
*Яе спрадвечны голас не чуцён.*
*— Няхай і так.*
*Затое ёсць парадак, —*
*Парыраваў пісьменнік-«пінкертон».*
*— А як жа я*
*Без любай, роднай мовы*
*Здалею ў вершах выкласці душу?*
*— Дык і маўчы,*
*Калі ты безгаловы.*
*Вось я па-руску, прыкладам, пішу.*
*— Чаму па-руску*
*Я пісаць павінен?*
*З дзяцінства мова*
*У мяне ў крыві.*
*Чаму мне рваць патрэбна пупавіну?*
*— А ты працей,*
*Працей, паэт, жыві.*
*Прызнаюся:*
*І я таксама з вёскі.*
*Калісь і я казаў не «да», а «так».*
*Ды скінуў тыя моўныя абноскі,*
*Як лахманы адкідвае жабрак.*
*— Дык мова —*
*Гэта ёсць народ, Радзіма.*
*Ці будзе беларусам беларус?*
*— Гайня нацдэмаў баек напладзіла*
*Пра шавінізм расійскі, пра аншлюс...*
*А нам Расія падсабляе газам*
*І нафту нам з ільготамі дае.*
*Мы змушаны*
*З Расіяй мецца разам*
*І «языком» прываблівацъ яе.*
*Ну, словам, мове*
*Адпяём хаўтуры...*
*У нас, паэт,*
*Нямала іншых тэм...*
*— Цяпер народ жыве пры дыктатуры!*
*А кожны беларус «і глух, і нем».*
*— Ты языком, паэт,*
*Дарма не пляцкай*
*І пачапі, як кажуць, на ланцуг.*
*Калі, крый бог,*
*Цябе пачуе Бацька,*
*Дык сапраўды ты станеш «нем і глух».*
*— Ва ўсе часы*
*Пісьменнікі да волі*
*Узнёслым словам*
*Клікалі народ!*
*— Спыні сваю рыторыку.*
*Даволі,*
*Як кажуць, бегчы бацькі папярод.*
*Твой вольны верш*
*Нікому не патрэбны,*
*Яго не ўчуюць людзі ў чарадзе.*
*Займі пасад пры ўладзе —*
*Ён жа хлебны.*
*Магчыма, што й табе перападзе.*
*Інакш пасадзяць*
*Ці пазбавяць працы —*
*Сабе, «змагар», запішаш у актыў.*
*А я затым —*
*Заўсёды рад старацца! —*
*Накрэмзаю з інтрыгай дэтэктыў.*

* * *

*Адным — пагрозы.*
*Брудных слоў нямала,*
*Другіх улада ўзносіць да нябёс.*
*Скажы, як жыць,*
*Скажы, пясняр Купала:*
*Няўжо твой паўтарыць*
*Трагічны лёс?..*

## «Дыпламаваны баран»

Як паведаміла «Народная Воля», жыхар Стаўбцоўскага раёна Андрэй Сакольнікаў паскардзіўся старшыні аблвыканкама на раённае кіраўніцтва. Пры гэтым дадаў, што «для павышэння ўзроўню Вашых падначаленых прашу арганізаваць курсы па вывучэнні байкі Кандрата Крапівы «Дыпламаваны баран»». Раённае кіраўніцтва пакрыўдзілася і падало на Сакольнікава заяву ў суд — за знявагу гонару і годнасці...

*А тую байку мы вучылі ў школе...*
*Яна для ўсіх —*
*На клёк звычайны тэст.*
*Для недасведчаных*
*З нагоды вось такое*
*Перакажу той байкі*
*Сціслы змест:*
*Дурны Баран*
*Адчайна-адрачона*
*У новыя вароты біў ілбом.*
*Яму на шыю*
*(Быццам ён вучоны)*
*З насмешкаю павесілі «дыплом».*
*Дадаткам жа —*
*І два радкі маралі*
*Пра тое, што Баран ні «мэ», ні «бэ».*
*Няўжо яны, чыноўнікі, пазналі*
*У гэтым Баране*
*Саміх сябе?*
*І на сваю мараль*
*Я маю права,*
*І выкажу сентэнцыю адну:*
*Падаць за параўнанне ў суд заяву —*
*Па праўдзе ўпадабацца Барану.*

### УВАГА: КОНКУРС!

**Паважаныя сябры!**

З 1 студзеня 2010 года Саюз беларускіх пісьменнікаў абвесціў новы конкурс на лепшы літаратурны твор, у якім асвятляецца вобраз жанчыны ў сучасным грамадстве і асэнсоўваюцца актуальныя гендэрныя праблемы.

На конкурс прымаюцца тэксты ўсемагчымых жанраў: паэзія, проза, драматургія, крытыка. Аўтарамі конкурсных твораў могуць быць і мужчыны, і жанчыны, і пачаткоўцы, і прафесіяналы.

Лаўрэатаў літаратурнага конкурса «Жанчына ў сучасным грамадстве», які будзе доўжыцца да 1 кастрычніка 2010 года, чакаюць прэміі, прызы і падарункі, а пераможца атрымае магчымасць выдаць свой тэкст асобнай кнігай!

Калі ласка, дасылайце свае творы на адрасы: паштовы — 220025, Мінск-25, а/с 91; электронны — sbp@tut.by.

**Сакратарыят Саюза беларускіх пісьменнікаў**

Кіраўнік праекта «ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» Алесь ПАШКЕВІЧ. Рэдактар Барыс САЧАНКА. Тэлефон для даведак: (8-017) 280-17-91. Мінск-25, а/с 91.
Адрас электроннай пошты: sbp@tut.by